WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛІСТАПАДА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 220
(26578)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

КУРС НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВАЛЮТЫ — СТАБІЛЬНЫ, ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ — РАСТУЦЬ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19 лістапада 2009 года прыняў з планавай справаздачай старшыню Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пятра Пракаповіча. Кіраўніку дзяржавы было даведзена, што ўсе паказчыкі Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі ў студзені — кастрычніку 2009 года выкананыя.

Па-ранейшаму стабільным застаецца курс нацыянальнай валюты, які ў дачыненні да кошыка замежных валют вагаецца ў межах абвешчанага калідора +/-10 %. За апошні час Нацыянальны банк Беларусі значна нарасціў золатавалютныя рэзервы. За 10 месяцаў гэтага года міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя ў адпаведнасці з метадалогіяй МВФ, павялічыліся больш чым у 1,4 раза — з $3,1 млрд на 1 студзеня да $4,43 млрд на 1 лістапада. Нацыянальны банк і надалей будзе нарошчваць золатавалютныя рэзервы. Чакаецца, што на 1 студзеня 2010 года яны складуць не менш за $5 млрд, што будзе добрай асновай для забеспячэння далейшай стабільнасці нацыянальнай валюты. Прэзідэнту таксама было даведзена, што ў Беларусі завяршыла працу чарговая місія МВФ па праграме «stand-by». Па стане на 1 кастрычніка 2009 года Нацыянальны банк выканаў усе паказчыкі па гэтай праграме. Вынікі працы камісіі ў найбліжэйшы час будуць разгледжаны на пасяджэнні Савета дырэктараў МВФ. «Мы ўпэўненыя ў тым, што чарговая транша крэдыту МВФ будзе атрымана ў снежні», — адзначыў Пётр Пракаповіч. Гэта таксама палепшыць сітуацыю ў краіне, у тым ліку з золатавалютнымі рэзервамі.

Банкаўская сістэма сёлета забяспечвае неабходнае крэдытаванне эканомікі. Гэты паказчык у параўнанні з 1 лістапада 2008 года павялічыўся больш чым у 1,4 раза, ільготнае крэдытаванне жылля — у 1,7 раза. Нацбанкам праводзіцца праца па ўдасканаленні працэнтнай палітыкі. «Дасягнута пагадненне з МВФ аб тым, што мы можам пачынаць працэс зніжэння працэнтных ставак. Мы плануем, што ўжо з 1 снежня 2009 года стаўка рэфінансавання будзе зменшана на 0,5 працэнтнага пункта — з цяперашніх 14 % гадавых да 13,5 % гадавых», — сказаў кіраўнік Нацбанка. Ён запэўніў, што ўжо ў першым паўгоддзі 2010 года працэнтныя стаўкі на беларускім рынку выйдуць на дакрызісны ўзровень.

Кіраўнік дзяржавы даручыў Нацбанку забяспечыць выкананне Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі ў цэлым па годзе і запатрабаваў ужо ў найбліжэйшы час разам з Урадам завяршыць працу над праектам Прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2010 год, праектам бюджэту і Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі. Пётр Пракаповіч адзначыў, што ўсе даручэнні Прэзідэнта па гэтых дакументах выкананыя і ўжо ў найбліжэйшы час, не пазней за 23 лістапада, яны будуць унесены на разгляд кіраўніку дзяржавы. Чакаецца, што канчатковае рашэнне па іх будзе прынята на наступным тыдні. «Нам вельмі важна ўжо ў гэтым месяцы атрымаць прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2010 год, а таксама па асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі, каб як мага хутчэй пачынаць канкрэтную працу па іх рэалізацыі», — падкрэсліў кіраўнік Нацбанка. Плануецца, што ў названых дакументах будуць замацаваныя такія паказчыкі, якія забяспечаць выкананне пяцігадовай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2006—2010 гады. У прыватнасці, прырост ВУП запланаваны на ўзроўні не менш за 11 %, інфляцыі ў межах 8—10 %.

Меры крымінальнай адказнасці маюць патрэбу ў аптымізацыі

Аб гэтым ішла размова на рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з генеральным пракурорам Беларусі Рыгорам Васілевічам.

Прынцыпова важным пытаннем, якое было абмеркавана ў кіраўніка дзяржавы, з'яўляецца вырашэнне праблемы аптымізацыі мераў крымінальнай адказнасці. У Генеральнай пракуратуры мяркуюць, што існуючая ў рэспубліцы структура пакаранняў не ў поўнай меры адпавядае сучасным рэаліям і неабходна ў большай ступені ўдзяляць увагу штрафным мерам адказнасці ўзамен пазбаўлення волі. Так, у агульнай структуры мераў крымінальнай адказнасці амаль 24 працэнты складае пазбаўленне волі і каля 10 працэнтаў — арышты. Гэта вялікая ўдзельная вага такіх пакаранняў, і трэба пераходзіць на іншыя, больш эфектыўныя меры, якія садзейнічалі б перавыхаванню злачынца. Аднак у тых выпадках, калі злачынца трэба ізаляваць ад грамадства, сапраўды неабходна прымаць рашэнне аб пазбаўленні волі. У найбліжэйшы час Генеральная пракуратура плануе ўнесці Прэзідэнту свае прапановы па аптымізацыі структуры пакаранняў у Беларусі. Акрамя таго, Аляксандру Лукашэнку было даведзена аб ходзе выканання даручэнняў, якія кіраўнік дзяржавы даў па выніках праведзенай 6 жніўня 2009 года нарады па пытаннях дзейнасці органаў пракуратуры.

Прэзідэнт таксама быў праінфармаваны аб крымінагеннай сітуацыі ў Беларусі. За апошнія 10 месяцаў адзначаецца зніжэнне колькасці злачынстваў у рэспубліцы, у тым ліку на 12,9 працэнта скарацілася колькасць забойстваў, на 11 працэнтаў — прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, колькасць разбояў зменшылася на 8 працэнтаў, а грабяжоў стала менш на 16 працэнтаў. Таксама скарачаецца колькасць крадзяжоў, у тым ліку кватэрных.

Суіскальнік вучонай ступені за плагіят або фальсіфікацыю будзе пазбаўляцца на 5 гадоў права абароны дысертацыі

У Беларусі ўведзены больш строгія патрабаванні да якасці работ суіскальнікаў вучонай ступені. Прэзідэнт Беларусі ўказам № 556 ад 17 лістапада ўнёс змяненні і дапаўненні ў Палажэнне аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Беларусі. Устаноўлена, што суіскальнік пазбаўляецца на 5 гадоў права абароны новай дысертацыі не толькі ў выпадку выяўлення плагіяту, але і пры выяўленні фальсіфікацыі або падлогу ў любых прадстаўленых матэрыялах. Вызначаны шэраг мераў, накіраваных на павышэнне якасці экспертызы дысертацый на пачатковых этапах іх разгляду. Прадугледжаны працэдуры, накіраваныя на забеспячэнне абароны інтарэсаў суіскальнікаў і аб'ектыўнасці пры прыняцці адмоўных рашэнняў у савеце па абароне дысертацый. Суіскальнікам вучоных ступеняў дадзена права выкарыстоўваць у кандыдацкіх дысертацыях матэрыялы іх магістарскіх работ. Акрамя таго, ва ўказе дыферэнцыяваны патрабаванні да суіскальнікаў вучонага звання дацэнта з улікам таго, працуюць яны ў ВНУ або ў навуковых арганізацыях, а таксама прадугледжана прыраўноўванне звання старшага навуковага супрацоўніка да звання дацэнта з выдачай адпаведнага атэстата. У мэтах эканоміі бюджэтных сродкаў абавязковае апублікаванне ў газеце аб'явы аб абароне дысертацыі заменена на размяшчэнне такой аб'явы на афіцыйным сайце ВАК.

Алімпійскім чэмпіёнам пенсійнага ўзросту ў Беларусі штомесяц будзе выплачвацца дзяржстыпендыя

У мэтах стымулявання дасягнення высокіх вынікаў беларускімі спартсменамі на Алімпійскіх гульнях у Беларусі заснавана штомесячная дзяржаўная стыпендыя алімпійскім чэмпіёнам, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 17 лістапада. Стыпендыя будзе складаць 300 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага ўрадам, за два апошнія кварталы (цяпер бюджэт пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва складае 250 070 рублёў). Яна будзе назначацца грамадзянам Рэспублікі Беларусь, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, якія, выступаючы ў складзе нацыянальных і зборных камандаў Беларусі або былога СССР па відах спорту, заваявалі залатыя медалі на Алімпійскіх гульнях, пры дасягненні мужчынамі ўзросту 60 гадоў, жанчынамі — 55 гадоў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў...

...Калектыў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка з 95-годдзем з дня заснавання ВНУ.

Гэта вучэбная ўстанова з'яўляецца адной з найстарэйшых педагагічных ВНУ краіны, найбуйнейшым цэнтрам падрыхтоўкі кадраў для ўстаноў адукацыі розных узроўняў, тэарэтычных і прыкладных даследаванняў. За мінулыя гады яе выпускнікамі сталі больш за 130 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія зрабілі вялікі ўклад у справу адукацыі і выхавання падрастаючага пакалення ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

«Перакананы, што ваш дружны, з'яднаны калектыў і надалей будзе плённа працаваць, развіваць добрыя традыцыі свайго ўніверсітэта, вырашаць тыя важныя задачы, якія сёння ставяць перад сістэмай адукацыі дзяржава і грамадства», — падкрэсліў Прэзідэнт.

...Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла з днём нараджэння

У віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца: «Знаходзячыся на Патрыяршым прастоле, Вы падаеце прыклад нястомнай рэлігійнай і грамадскай дзейнасці, накіраванай на зацвярджэнне ідэалаў дабра, справядлівасці, чалавекалюбства і міласэрнасці, падтрыманне стабільнасці і згоды ў грамадстве. Праваслаўныя вернікі Беларусі з вялікай удзячнасцю прымаюць Вашу архіпастырскую апеку аб нашай зямлі, якая захоўвае памяць пра агульнае гістарычнае мінулае братоў-славян. Незабыўнае ўражанне ў сэрцах суграмадзян пакінуў Ваш нядаўні візіт, мудрыя словы блаславення і духоўнага наказу жыхарам Белай Русі».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Патрыярху здароўя і даўгалецця, невычэрпнай энергіі ў высокім служэнні Царкве і Айчыне.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВЫЯЗНЫ ПЕДСАВЕТ

Пасёлак Калодзішчы Мінскага раёна.

Колькасць зваротаў па медыцынскую дапамогу ў сувязі з ВРВІ прадаўжае ў Беларусі зніжацца

У Беларусі ўзровень зваротаў па медыцынскую дапамогу ў сувязі з ВРВІ прадаўжае зніжацца. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.

Колькасць зваротаў 16 лістапада ў параўнанні з папярэднім днём знізілася на 19,7 працэнта, у тым ліку сярод дзяцей — на 17,3 працэнта, дарослых — на 21 працэнт. У параўнанні з 9 лістапада гэты паказчык знізіўся на 58,5 працэнта (сярод дзяцей — на 66,6 працэнта, дарослых — на 51,6 працэнта). У Брэсцкай вобласці колькасць зваротаў па медыцынскую дапамогу скарацілася на 27,7 працэнта, Віцебскай — на 63,2 працэнта, у Гомельскай — на 4,4 працэнта, у Гродзенскай — на 32,6 працэнта, Мінску — на 79,7 працэнта, у Мінскай вобласці — на 26,9 працэнта, у Магілёўскай — на 40,6 працэнта. У структуры хворых на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі па-ранейшаму пераважаюць дарослыя (63,1 працэнта).

Усяго з пачатку эпідэмічнага перыяду (з 1 кастрычніка па 16 лістапада) у кантрольных гарадах зарэгістравана 601 тыс. 926 выпадкаў захворвання на ВРВІ.

У рэспубліцы з мая 2009 года вядзецца штодзённы маніторынг захваральнасці на ВРВІ, этыялагічнай структуры ўзбуджальнікаў захворванняў, а таксама пастаяннае адсочванне эпідэмічнай сітуацыі ў свеце. Усяго за перыяд маніторынгу зарэгістравана 165 выпадкаў захваральнасці на пандэмічны грып A/H1N1, у тым ліку за перыяд эпідэмічнага ўздыму захваральнасці 139 выпадкаў (0,02 працэнта ад агульнай колькасці хворых на ВРВІ). Вірус грыпу A/H1N1 знойдзены у 13 чалавек, якія памерлі ад пнеўманіі.

У Міністэрстве аховы здароўя таксама расказалі, што колькасць новых выпадкаў захворвання на пнеўманію штодзень змяншаецца. Так, 16 лістапада ў стацыянар паступіла 757 чалавек, што на 143 менш у параўнанні з папярэднім днём. У аддзяленнях рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі арганізацый аховы здароўя знаходзяцца 763 чалавекі, з якіх 722 — дарослыя.

Па стане на 16 лістапада супраць сезоннага грыпу прышчэплена 977 тыс. 459 чалавек, што на 31,4 працэнта больш, чым у 2008 годзе. Прадаўжаецца вакцынацыя за кошт уласных сродкаў грамадзян, прадпрыемстваў і мясцовых бюджэтаў.

У мэтах папярэджання распаўсюджвання ВРВІ ў 872 установах адукацыі навучальны працэс прыпынены, адноўлены заняткі ў 1 тыс. 267 установах.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2009 г. (для б/н разлікаў)		*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*	
▲ 1 долар ЗША	2 732,00	Цэнтрабанк РФ	
▼ 1 еўра	4 061,39	USD	28,7459
1 латвійскі лат	5 732,87	UAH	35,3144
1 літоўскі літ	1 176,12	1000 BYR	10,5374
1 чэшская крона	159,59	EUR	42,7998
1 польскі злоты	984,68		
▲ 1 расійскі рубель	95,04		
1 украінская грыўня	334,80		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

МАЦІ, РАТУЮЧЫ ДАЧКУ, АДПІХНУЛА ЯЕ АД АЎТО

РАНІЦАЙ у Гомелі перад нерэгулюемым пешаходным пераходам сутыкнуліся два аўтамабілі, у выніку чаго пешаходу давялося ратаваць сваё дзіця.

Паводле звестак ДАІ МУС, 30-гадовы кіроўца аўтамабіля «Фальксваген» ехаў у аўтамабіль «Хонда», які спыніўся перад пераходам. Ударам апошнюю машыну адкінула ўперад на пешаходны пераход і аўтамабіль учыніў датычны наезд на 30-гадовую жанчыну, якая пераходзіла дарогу. Жанчына ішла разам з чатырохгадовай дачкой і, імкнучыся ўратаваць яе, адпіхнула дзіця ўбок. Дзяўчынка, якая ўпала, зламала ключыцу.

Фота прадстаўлена абласным ДАІ.

А ў Гродзенскай вобласці ДТЗ мела трагічныя наступствы — загінулі юнак і 14-гадовая дзяўчына. На 9-м кіламетры аўтадарогі Гродна — Гожа — мяжа Літвы каля паловы на дванаццатую ночы 19-гадовы кіроўца «Фальксвагена» на закругленні дарогі не справіўся з машынай і аўтамабіль апынуўся ў кюветы, перакуліўся. І кіроўца, і яго няпоўнагадовая пасажырка загінулі на месцы здарэння.

Ігар ГРЫШЫН.

«ШЧАЎКУНОК» — МАНЕТНАЯ КАЗКА

НАЦЫЯНАЛЬНЫ банк Рэспублікі Беларусь з сённяшняга дня выпускае ў абарачэнне сярэбраную памятную манету «Шчаўкунок» серыі «Казкі народаў свету», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Манета адчаканена на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «анцыркулейтэд». Паверхня манет аксідзіравана. Тыраж новай манеты складае да 25 тысяч штук.

На сыху

ТАЦЦЯНА ПРАДАЛА ДАЧКУ ЗА 200 ДОЛАРАЎ?

ВЯСКОВУЮ жыхарку абвінавачваюць у гандлі людзьмі. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з Таццянай Шупеняй з вёскі Смальяны, якая сем гадоў таму перадала родную дачку на выхаванне расіянцы.

Паведамленне інфармагенцтва БелТА пра продаж дзіцяці страсянула ўсю краіну. Крыніца ў пракуратуры Віцебскай вобласці паведаміла журналістам: жанчыне пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі, яна прадала дачку 1995 года нараджэння за 200 долараў ЗША.

Карэспандэнт «Звязды» выправіўся ў вёску Смальяны Аршанскага раёна, дзе жыве падазроная. За некалькі дзён да нашага прыезду жанчыну выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе з Аршанскага СІЗА.

*— Яна жыхарка не наша, ніколі не была тут прапісана, — сустрэла карэспандэнта «Звязды» **Галіна КАРПУШОНАК, старшыня Смальянскага сельвыканкама**. — У 90-я гады ў яе расла дзяўчынка, каля месяца яна і ў дзіцячым калектыве паспела пабыць. Але маці і дачка з'ехалі са Смальянаў гадоў на 6-7. Вярнулася Таццяна дзесьці ў мінулым-пазамінулым годзе, але ўжо без дачкі. Жанчына вядзе няправільны лад жыцця, стаіць на трасах...*

Куды знікла дзяўчынка, ніхто не ведае, а па Смальянах ходзяць страшныя чуткі.

— Нехта кажа, што яна дачку прадала, нехта — што забіла, — перадалі карэспандэнту «Звязды» вясковую гаману з смальянскай спажывецкай краме. — Жыве Таццяна зараз на Падсобным (частка Смальянаў. — **Аўт.**) у Манашкі (мянушка мясцовай жыхаркі. — **Аўт.**).

— Гэта няпраўда, я не продавала, а аддала сваю малую ў харошыя рукі. А тут ужо «нагналі», што і закапала, і забіла... Дачку завуць Аліна Шупеня, цяпер ёй 14. Аддала яе на выхаванне расіянцы ў сямігадовым узросце. А нядаўна вырашыла зрабіць новы пашпарт. У мяне спыталіся, дзе дачка, я і расказала ўсё. І тут пачалося...

Падыходжу да аднапавярховага цаглянага дома, дзе апрач жанчыны па мянушцы Манашка жыве яе сын Андрэй, грамадзянскі муж Таццяны Шупені. Каля форткі сустракае малы сабачка. Пачуўшы брэх, на двор выйшаў гаспадар хаты. За некалькі дзён да майго прыезду Андрэй выгнаў тэлевізійшчыкаў. Настойліва прашу мужчыну пусціць мяне да Таццяны.

З парога пытаюся ў жанчыны, няўжо яна прадала ўласную дачку за 200 долараў?

— Гэта няпраўда, я не продавала, а аддала сваю малую ў харошыя рукі, — пачала распавядаць Таццяна, прысеўшы на драўлянае крэсла. *— А тут ужо «нагналі», што і закапала, і забіла... Дачку завуць Аліна Шупеня, цяпер ёй 14. Аддала яе на выхаванне расіянцы ў сямігадовым узросце. А нядаўна вырашыла зрабіць новы пашпарт. У мяне спыталіся, дзе дачка, я і расказала ўсё. І тут пачалося...*

— Навошта вы аддалі Аліну?

— Жылося вельмі цяжка. У хлявах даводзілася начаваць. Калі памёр бацька, паехала жыць у Расію да цёткі, у Саратаў. Там Аліна нарадзілася. Цётцы мы надакучылі, давялося вяртацца ў Смальяны. Тут сястра родная жыла, моцна піла. Здаралася, нам не было чаго есці. І тут знаёмая расіянка прапанавала: «Аддай дачку мне, вырасце, я ёй усё патлумачу. Падумай, што з яе выйдзе, калі будзе жыць з табой?»

— І дзе гэта расіянка, вы ўпэўненыя, што з дачкой усё ў парадку?

— У міліцыі таксама казалі: можа, дачку на органы прадалі, можа, закапалі дзе. Але я ўпэўненая, што яна расце ў добрай сям'і. Мяне і на дэтэктары правяралі. Дзе жыве гэта расіянка, я вам не скажу, хоць у міліцыі гэта паведаміла. З жанчынай гэтай я была трохі знаёмая. Яна вельмі добрая і станоўчая, мае фірму, машыну, хоць і не самую крутую. Сваіх дзяцей у яе не было, з-за гэтага нават з мужам развялася.

— За сем гадоў вы цікавіліся лёсам дачкі?

— Не. Яны мяняюць тэлефоны, сімкі. А я запіла... Так яшчэ здарылася, што сястра загінула. Працавала на жывёлагадоўчай ферме, яе мядзведзь загрыз. Быў у мяне фотаздымак дачкі, але яго забралі ў міліцыі. Цяпер не ведаю, што рабіць. У міліцыі лухты рознай нагаварылі, далі падпісаць нейкія паперы. Сказалі чакаць. Як прыехала з міліцыі, піць увогуле перастала.

Расследаваннем крымінальнай справы займаецца следчы аддзел Аршанскага РАУС. Міліцыянерам Таццяна сказала, што атрымала ад жанчыны, якой перадала дачку на выхаванне, 200 долараў пад'ёмных. Адсюль у інфармацыйных агенцтвах і з'явілася інфармацыя пра продаж дачкі за гэтыя грошы.

Але ці можна кваліфікаваць учынак Таццяны Шупені як «гандаль людзьмі»? Жыхары Смальянаў лічаць, што калі дзяўчынка патрапіла ў добрую сям'ю, гэта для яе будучыні лепей, чым жыць з гора-матуляй.

Поўная інфармацыя па гэтай гучнай крымінальнай справе стане вядомая, калі дзяўчынку адшукаюць.

Яўген ВАЛОШЫН.

Смальяны — Орша — Мінск.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД ЗАБАРАНІЎ ПРЫМЯНЯЦЬ У РАСІІ СМЯРОТНУЮ КАРУ



Канстытуцыйны Суд Расіі вынес пастанову, згодна з якой смяротная кара ў краіне не можа прымяняцца нават пасля заканчэння мараторыя на вышэйшую меру пакарання — 1 студзеня 2010 года.

Як заявіў старшыня КС РФ Валерый Зоркін, у члены Савета Еўропы Маскву запрасілі толькі пасля абяцання адмяніць смяротную кару.

ЮШЧАНКА ХОЧА ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ ГАЗАВЫЯ КАНТРАКТЫ З РАСІЯЙ

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка выступіў з афіцыйным зваротам да прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева, у якім раскрытыкаваў шэраг палажэнняў аб існых газавых кантрактах «Газпрама» і «Нафтагаза».

Юшчанка, у прыватнасці, прапанаваў увесці ў кантракты па транзіце прынцып «пампуй або плаці», аналагічны прынцыпу «бяры або плаці» ў кантрактах на пастаўкі расійскага паліва ва Украіну. Кантракты «бяры або плаці» дазваляюць Расіі аштрафаваць Украіну за недабор газу, тады як у кантрактах не прадугледжаны практычна ніякія санкцыі да расійскага боку за магчымае невыкананне Масквой абавязацельстваў па транзіце паліва. Юшчанка ўказвае, што кошт на расійскі газ для Украіны павялічыўся амаль утрая і на сёння перавышае сярэднееўрапейскі кошт, а стаўка за транзіт расійскага газу па тэрыторыі Украіны застаецца нязменнай і ў 2,5—3 разы ніжэй у параўнанні з коштам на транзіт у іншых еўрапейскіх краінах. На думку Юшчанкі, «Нафтагаз» недаатрымаў ад 2 да 3 мільярдаў долараў за свае паслугі па транзіце расійскага газу ў Еўропу.

Юшчанка, супернік Цімашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах, што адбудуцца ў студзені 2010 года, раней неаднойчы крытыкаваў пагадненні з Расіяй. Цімашэнка, якая падпісала ў студзені гэтыя кантракты, сцвярджае, што яны выгадныя для Украіны.

СААКАШВІЛІ АДЗНАЧЫЎ ГЕРАІЗМ ЮШЧАНКІ ОРДЭНАМ

Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі ўзнагародзіў украінскага калегу Віктара Юшчанку вышэйшай дзяржаўнай узнагародай сваёй краіны — ордэнам Святога Георгія.

Узнагароджанне адбылося падчас цырыманіі адкрыцця новага будынка грузінскага пасольства ў Кіеве, на якую прыбылі абодва лідары.

«Дазвольце мне ад імя народа Грузіі падзякаваць усім вам і ўручыць за гераізм, за сяброўства, за падтрымку вышэйшую ўзнагароду грузінскай дзяржавы — ордэн Святога Георгія», — сказаў Саакашвілі.

Юшчанка адказаў, што атрыманне гэтага ордэна з рук грузінскага прэзідэнта — вялікі гонар для яго.

У ПОЛЬСКАЙ ШКОЛЕ ВЫЯВІЛІ РЭКОРДНУЮ ПЛАНТАЦЫЮ КАНОПЛІ

У закінутай школе, размешчанай у цэнтральнай частцы Польшчы, выявілі плантацыю з некалькіх тысяч кустоў канопляў.

Акрамя таго, супрацоўнікі Цэнтральнага бюро расследаванняў (CBS) знайшлі ў трохпавярховым пустым будынку 720 саджанцаў канопляў і 124 кілаграмы гатовай да продажу марыхуаны. Будынак быў абсталяваны сродкамі сігналізацыі і назірання. Па словах прадстаўніка паліцыі, па падазрэнні ў вырошчванні марыхуаны арыштаваныя чатыры чалавекі. Ён таксама ўдакладніў, што выгадаваная ў самім цэнтры краіны марыхуана прадавалася ў шматлікіх раёнах Польшчы. Выяўленне плантацыі, якую прадстаўнік CBS ахарактарызаваў як самую вялікую ў Польшчы, стала вынікам расследавання, якое спецслужбы вялі на працягу некалькіх месяцаў.

НЯЎДАЧЛІВЫМ У КАХАННІ КІТАЙЦАМ ДАДУЦЬ АДГУЛЫ

Шанхайская кампанія прапанавала пацярпелым няўдачу ў каханні супрацоўнікам аплачаны адгул.

Па словах аднаго з кіраўнікоў кампаніі, любы супрацоўнік можа адзін раз у два гады атрымаць двухдзённы аплатны адгул з-за няўдалага асабістага жыцця. Пры гэтым ад супрацоўнікаў не патрабуюць прад'яўлення доказаў. У выпадку разводу кожны супрацоўнік кампаніі можа не прыходзіць на працу на працягу трох дзён.

Паведамляецца таксама, што правіла дзейнічае ўжо год, аднак ніхто з супрацоўнікаў яшчэ не прызнаў сябе няўдачнікам у каханні дзеля атрымання адгулу. Тым не менш кіраўнікі лічаць, што падобныя правілы дапамагаюць стварацца «хатнія» абставіны на працы.

Падобная сістэма дзейнічае ў невялікай японскай кампаніі, супрацоўніцы якой могуць, у залежнасці ад узросту, атрымаць ад аднаго да трох дзён адгулу ў год у выпадку разрыву адносінаў з мужчынам.

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР СЛАВЕНІІ ПАЧЫСЦІЎ БУЦЫ ФУТБАЛІСТАМ

Прэм'ер-міністр Славеніі Борут Пахар пачысціў буцы гульцам зборнай сваёй краіны па футболе пасля таго, як яны перамаглі зборную Расіі ў барацьбе за выхад на чэмпіянат свету 2010 года.

Пахар, які выканаў дадзенае ў сярэдзіне кастрычніка абяцанне, прызнаўся, што чысціў буцы не вельмі старанна.

Прамая лінія

Якім будзе адрас дапамогі?

Новыя ўмовы атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі, падтрымка інвалідаў, а таксама ўсе «пенсійныя пытанні» — гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**. Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **8 снежня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары **287 17 57**.

Футбол. ЧС-2010

ХТО НА МУНДЗІЯЛЬ — РУКІ РАСПУСКАЙ

НАПРУЖАНАСЦЬ стыкавых гульняў і жаданне паехаць на чэмпіянат свету па футболе 2010 зрабілі другія стыкавыя гульні напружанымі ледзь не да боек на полі.

Менавіта памахаць кулакамі вельмі хацелася славенцам у адказ на жаданне расіян забіць патрэбны ім гол. Але не атрымалася. У расіян. Каманда Славеніі перамагла зборную Расіі на сваім полі з лікам 1:0, паказаўшы пры гэтым выдатнае акцёрскае майстэрства сваіх гульцоў. У момантах, калі супраць славенцаў парушалі правілы расіяне, адчуванне было, што гаспадарам як мінімум «хуткую» трэба было выклікаць. За кошт мяча на чужым полі Славенія паедзе на мундзіяль. У гэтай гульні ў расіян былі выдалены два футбалісты — Кержакоў, нібыта за нападзенне на варатара, і Жыркоў, які занадта актыўна хацеў адабраць мяч у супрацоўніка, які яго падаваў. Украінцы ў Данецку з такім жа лікам саступілі грэкам і таксама «праляцелі» міма чэмпіянату. Зноў жа, лік 1:0 быў зафіксаваны ў Зеніцы, дзе партугальцы ў гасцях абыгралі зборную Босніі і Герцагавіны. А чэмпіён свету-1998 каманда Францыі на сваім полі са скандалам атрымала нічыю ў матчы з ірландцамі, якая дазволіла ім таксама паехаць на чэмпіянат. Госці першымі адкрылі лік і маглі давесці справу да пасляматчавых пенальці, але нападаючы французаў Цьеры Анры падыграў сабе рукой, і яго партнёр Уільям Галас забіў гол. Суддзя паказаў на цэнтр, французы ў марах уявілі сябе ў Афрыцы, а справа Марадоны а-ля «рука Бога», як бачна, жыве і цяпер. У Лацінскай Амерыцы зборная Уругвая згуляла дома ўнічыю з Коста-Рыкай —1:1 — і пасля гасцявой перамогі таксама едзе ў Паўднёвую Афрыку.

Такім чынам, спіс усіх удзельнікаў чэмпіянату свету 2010 года па футболе. **Краіна-арганізатар:** ПАР; **Азія:** Японія, КНДР, Паўднёвая Карэя, Аўстралія; **Афрыка:** Гана, Кот-д'Івуар, Камерун, Нігерыя, Алжыр; **Еўропа:** Нідэрланды, Англія, Іспанія, Германія, Данія, Італія, Сербія, Славакія, Швейцарыя, Грэцыя, Славенія, Партугалія, Францыя; **Паўднёвая Амерыка:** Бразілія, Парагвай, Чылі, Аргенціна, Уругвай; **КАНКАКАФ:** Мексіка, ЗША, Гандурас; **Акеанія:** Новая Зеландыя.

А нацыянальная каманда Беларусі ў таварыскім матчы ў гасцях саступіла зборнай Чарнагорыі — 0:1. У гэтай гульні таксама быў выдалены з поля беларускі футбаліст — абаронца Дзмітрый Верхаўцоў.

ISSN 1990 - 763X

НАС ЧАКАЮЦЬ НАВАГОДНІЯ ЗНІЖКІ

У сталічных крамах упершыню перададнавагоднія зніжкі на тавары айчынных вытворцаў могуць дасягнуць 30 працэнтаў.

Буйныя крамы сталіцы гатовыя знізіць цэны на тавары айчынных вытворцаў да 15 працэнтаў. Такіх жа ўступак чакаюць і ад пастаўшчыкоў.

«Мінск—Навіны».

Парламенцкі дзённік

З 14 ДА 31

Сенатары ўхвалілі законапраект аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі

Пасля доўгіх спрэчак распрацоўшчыкі сышліся на тым, што маладымі варта лічыць грамадзян ад 14 да 31 года. Сёння ў такой кагорце кожны чацвёрты беларус.

— Гэта рэальная актыўная сіла, — зазначыла ў гутарцы з журналістамі **Антаніна МОРАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**

І сілу тую заканатворцы хацелі б бачыць інавацыйна-крэатыўнай. Адпаведныя падыходы замацаваныя ў праекце, які, паводле слоў сенатара, «скіраваны на тое, каб яшчэ больш актывізаваць работу і моладзі, і з моладдзю».

У праекце прапісана, што такое маладая сям'я, студэнцкі атрад, валанцёрскі рух і гэтак далей. Не такое новае само па сабе, але ж важнае заканадаўчае замацаванне асноўных кірункаў работы з моладдзю:

— Работа з таленавітай, адоранай моладдзю, работа грамадскіх аб'яднанняў, падтрымка моладзі ў вырашэнні жыллёвых праблем, атрыманні адукацыі.

Нароўні з уплятаннем у канву законапраекта навацый, ішло і замацаванне многіх формаў работы, што практыкаваліся яшчэ ў часы камсамола. «Аднак гэта ні ў якім разе не вяртае нас у савецкія часы, — перакананая А. Морава, — валанцёрскі рух і студатрады — гэта агульнапрызнаныя сусветныя формы работы, запатрабаваныя моладдзю». Старшыня Пастаяннай камісіі зрабіла акцэнт на праграмна-мэтавым падыходзе, прадугледжаным у законапраекце. У адпаведнасці з ім і размяркоўваюцца сродкі на праекты.

— У нас ёсць 37 арганізацый, якія працуюць з моладдзю, 15 з іх карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай. І яны змяняюцца: праект больш цікавы, больш эфектыўны — значыць, будзе пэўная дзяржаўная падтрымка. Усё гэта на конкурснай аснове. Так, БРСМ — у нас самая масавая арганізацыя, і формы работы ў іх сталыя, дастаткова сур'ёзныя, але ёсць і іншыя арганізацыі. Напрыклад, Ліга вольнай працы моладзі — яны займаюцца другаснай занятасцю, вельмі важнае пытанне вырашаюць. Таксама вельмі сур'ёзная арганізацыя.

Нагадала сенатар і пра пасаду спецыяліста па рабоце з моладдзю, якую, паводле закона, можна будзе ўводзіць і на дзяржаўных прадпрыемствах, і ў камерцыйных арганізацыях:

— З цягам часу гэта будзе ўведзена ў класіфікатар, а ён ужо вызначыць тыя функцыі, якія павінны выконваць гэтыя спецыялісты.

Міністру адукацыі Аляксандру РАДЗЬКОВУ ўяўляецца асабліва важным, што ў законапраекце прадугледжваецца правядзенне навуковых даследаванняў па праблемах моладзі.

— Гэтыя даследаванні плануецца весці на доўгатэрміновай аснове, іх вынікі будуць выкарыстаныя пры падрыхтоўцы штогадовага дакладаў аб становішчы моладзі ў Беларусі, што таксама прапісваецца ў законе, — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Зафіксавана таксама, што распрацоўка рэспубліканскіх і рэгіянальных праграм у сферы моладзевай палітыкі будзе весціся з улікам меркавання саміх маладых людзей.

— Для пашырэння іх удзелу ў рэалізацыі моладзевай палітыкі пры дзяржаўных органах могуць стварацца дарадчыя органы з ліку маладых грамадзян, — адзначыў міністр яшчэ адно палажэнне законапраекта. — Прадугледжваецца аказанне дзяржаўнай падтрымкі таленавітай і адоранай моладзі, вядзенне перспектыўнага кадравага рэзерву з ліку маладых грамадзян, нават прапісаныя адпаведныя банкі звестак.

Так што пакуль расіяне абвяшчаюць год моладзі і абмяркоўваюць вартасць прыняцця закона, беларусы яго ўжо прымаюць. І калі дакумент не сыдзе з дыстанцыі, ён стане першым законам такога кшталту на ўсёй прасторы СНД.

Паўстала і пытанне аб стварэнні асобнага падраздзялення па справах моладзі — як заўжды пры публічным абмеркаванні моладзевай тэматыкі. Пазіцыя Міністэрства адукацыі, якую агучыў Аляксандр Радзькоў, — варта стварыць пры Савеце Міністраў Камітэт па справах моладзі, аднак падчас дыскусій з сенатарамі ён не выключыў і тое, што «магчыма, мы выспеем нават для міністэрства».

МІНІСТР: «РАЗМЕРКАВАННЕ — ГЭТА ДАБРОТА»

Журналісты ж у гутарцы з Аляксандрам Радзьковым бянтэжыліся наконт абавязковасці размеркавання выпускнікоў, якую, паводле слоў міністра, адмяняць не плануецца. Кіраўнік ведамства перакананы, што размеркаванне — гэта даброта, прычым не толькі для дзяржавы. Малады спецыяліст атрымлівае першае працоўнае месца, а гэта, на думку міністра, вельмі каштоўна. Дзе яно будзе, гэтае першае працоўнае месца, — пытанне асобнае: пакуль мала хто з мінчан прагне апынуцца на забруджанай пасля аварыі на ЧАЭС тэрыторыі, у ціхім невялічкім мястэчку. У адказ на роспыты журналістаў міністр зазначыў, што апошнім часам сярод моладзі становіцца модным ехаць працаваць у сельскую мясцовасць. Там рэалізуецца шмат праектаў у рамках праграмы адраджэння і развіцця вёскі, асабліва паказальныя ў гэтым плане аграгарадкі. Што ж, дзяржава зацікаўленая ў тым, каб развіваць розныя рэгіёны, і размеркаванне ёй у гэтым дапамагае. Толькі вось знайшоўшы сабе месца працы самастойна, выпускнік, думаю, таксама працаваў бы на карысць дзяржавы і гэтаксама плаціў бы падаткі ў дзяржаўную казну...

НА КАРАНЦІНЕ ТОЛЬКІ ТРЫ ШКОЛЫ

Пацікавіліся таксама і сітуацыяй з захваральнасцю на грып і ВРВІ ва ўстановах адукацыі. Як запэўніў міністр, у параўнанні з пачаткам месяца яна знізілася ў чатыры разы і не выклікае трывогі. Ва ўсіх адукацыйных установах зробленыя неабходныя прафілактычныя захады — больш частае праветрыванне, санітарная апрацоўка, павелічэнне ў рацыёне такога карыснага ў гэты час часнаку, адмова ад правядзення масавых мерапрыемстваў. Ён нагадаў, што Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя штодзень праводзяць маніторынг і пры неабходнасці прымаюць рашэнні аб закрыцці на каранцін асобных адукацыйных устаноў. Пакуль такі лёс напаткаў толькі тры сталічныя школы, а ВНУ і ПТВ гэта доля абмінула.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Твае правы

БЕЗ ПРЭМІІ. АДНАК БЕЗ ШТРАФУ

Любая праца — справа заўсёды адказная, прычым не толькі з пункту гледжання дысцыпліны. Калі-нікалі тут можа ўзнікнуць пасапраўднаму непрыемная сітуацыя — страта ці выпадковае пашкоджанне абсталявання, нястача ці крадзеж маёмасці падчас дзяжурства вартаўніка. Зразумела, што ва ўсіх гэтых выпадках гаворка ідзе аб матэрыяльнай страце наймальніку. Ці абавязаны кампенсаваць яе работнік і што рабіць, калі сваёй віны ён усё ж не адчувае? Разабрацца з гэтымі пытаннямі мы паспрабуем з дапамогай загадчыка юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзіміра Іванавіча ШЭЛКОВІЧА.

Кантракт сарваўся. Хто адкажа?

Вінен — вярнуць павінен. Па сутнасці гэта правіла дзейнічае заўсёды, калі ў выніку дзеянняў ці нават бяздзеяння свайго супрацоўніка арганізацыя панесла тую ці іншую страту. Прычым сама па сабе кампенсацыя страты не залежыць ад прыцягнення да дысцыплінарнай, адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці — гэтыя меры могуць выкарыстоўвацца паралельна.

Праўда, тут ёсць пэўныя нюансы. Так, немагчыма ўскласці на работніка адказнасць за шкоду, якая адносіцца да катэгорыі нармальнай рызыкі — скажам, падчас вядзення эксперыментальнай вытворчасці ці ўкаранення новых тэхналогій. Патрабаванне кампенсацыі недарэчнае, калі супрацоўнік дзейнічаў для прадухілення надзвычайных здарэнняў ці аварый. Плюс да таго, таксама нельга прыцягнуць да матэрыяльнай адказнасці работніка, які не парушыў свае непасрэдныя працоўныя абавязкі.

— Падставай для прыцягнення да матэрыяльнай адказнасці можа быць толькі прамая страта, нанесеная супрацьпраўнымі дзеяннямі, невыкананнем або неналежным выкананнем працоўных абавязкаў, — адзначае Уладзімір Шэлковіч. — У той жа час нельга запатрабаваць кампенсацыі «недаатрыманых» даходаў — скажам, у сітуацыі, калі работнік не здолеў дамовіцца наконт меркаванага кантракта на пастаўку прадукцыі.

Гэтаксама нельга патрабаваць ад работніка выплаты кампенсацыі за «страчаны» на перакуры час. Ці за неахайны знешні выгляд.

— Вядома, што калі-нікалі знешні выгляд можа «спалохаць» патэнцыяльнага кліента, і зноў-такі арганізацыя страціць пэўную выгаду, — заўважае Уладзімір Шэлковіч. — Але ні прыцягнуць да матэрыяльнай адказнасці, ні нейкім чынам аштрафаваць за гэта наймальнік не мае права — тыя ж штрафы адносяцца выключна да кампетэнцыі пэўных органаў, скажам, судоў, МНС, падатковай інспекцыі ці інспекцыі працы. Сапраўды, апошнім часам многія арганізацыі надаюць увагу карпаратыўнай культуры і вызначаюць у сваіх лакальных нарматыўных прававых актах асаблівыя правілы ўнутранага распарадку. Аднак парушэнне гэтых правілаў ці формы адзення можа пацягнуць максімум адно — дысцыплінарную адказнасць. Напрыклад, частковае або поўнае пазбаўленне прэміі — і тое, калі гэта прадугледжана палажэннем аб прэміяванні.

Дамовіцца — някепскі варыянт

Работнік, які прычыніў наймальніку страту, можа кампенсаваць яе добраахвотна, і ў тым ліку — перадаць у распараджэнне наймальніка раўназначную або адрамантаваць пашкоджаную маёмасць. Як кажуць, тут асноўным становіцца прынцып узаемнай згоды. Калі ж такой згоды няма, то пакрыццё выдаткаў у памеры менш за сярэдні месячны заробак робіцца распараджэннем наймальніка шляхам утрымання з зарплаты. Такое распараджэнне робіцца не пазней чым праз два тыдні з дня выяўлення страты і пачынае дзейнічаць не раней чым праз 10 дзён з дня паведамлення работніку. Прычым да выдання распараджэння аб утрыманні з зарплаты работнік павінен даць пісьмовыя тлумачэнні.

— Крыху іншая сітуацыя — калі памер страты перавышае сярэднямесячны заробак, — кажа Уладзімір Шэлковіч. — У такім выпадку ўсе пытанні наконт кампенсацыі вырашаюцца толькі ў судзе.

Частка або цалкам?

Работнік, які прычыніў страту, як правіла, кампенсуе яе цалкам. Аднак заканадаўства вызначае і магчымасць абмежаванай адказнасці. У прыватнасці, такая адказнасць (у памеры не больш чым сярэдні заробак за месяц) прадугледжваецца тады, калі супрацоўнік сапсаваў або знішчыў матэрыялы, паўфабрыкаты, гатовую прадукцыю, інструменты ці спецадзенне па неасцярожнасці. За наўмысныя ж дзеянні давядзецца заплаціць цалкам.

— Працоўны кодэкс вызначае, што абмежаваная матэрыяльная адказнасць можа выкарыстоўвацца і ў некаторых іншых выпадках — такія выпадкі пазначаюцца ў калектыўных дагаворах і пагадненнях, — распавядае Уладзімір Шэлковіч. — Але ў любым выпадку страту давядзецца кампенсаваць цалкам, калі работнік узяў на сябе поўную матэрыяльную адказнасць за захаванне маёмасці і іншых матэрыяльных каштоўнасцяў, калі маёмасць была давераная «пад справаздачу», калі страта стала вынікам злачынства, калі работнік знаходзіўся ў стадыі алкагольнага ап'янення або сапсаваў маёмасць свядома — незалежна ад таго, ці ўваходзіць работа з гэтай маёмасцю ў непасрэдныя працоўныя абавязкі.

Ліміт у 20 працэнтаў

Між тым выплата страты — тэма асобная і няпростая. Не сакрэт, што ў некаторых выпадках гаворка ідзе аб значных сумах, адшукаць якія адразу вельмі праблематычна. Таму ў заканадаўстве вызначана: кампенсацыя стратаў робіцца паступова. Незалежна ад агульнай сумы з работніка робяцца штомесячныя ўтрыманні. А ў сваю чаргу памер такіх утрыманняў не перавышае 20 працэнтаў зарплаты. Пры гэтым утрыманні не спаганяюцца з выхадной дапамогі, кампенсацыйных і некаторых іншых выплат.

Да слова, падобнае правіла вяртання выкарыстоўваецца і тады, калі работніку былі выплачаныя залішнія грошы ў выніку разліковай памылкі. Тыповы прыклад у гэтым выпадку — памылковае налічэнне большых, чым трэба, «адпускных» ці «дэкрэтных».

Калі пацерпіць рэпутацыя...

Калі работнік з неабходнасцю кампенсацыі матэрыяльнай страты не згодны, ён можа звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках. Або на працягу 3 месяцаў падаць заяву ў суд. Адно, што трэба заўважыць: калі работнік ужо прайшоў камісію па працоўных спрэчках, то «абскардзіць» яе рашэнне ў судзе неабходна на працягу 10 дзён.

Пры гэтым цікава: калі ў выніку суд возьме бок работніка, то ў яго ёсць магчымасць... звярнуцца з іскам да наймальніка. З просьбай аб кампенсацыі маральнай страты. Бо ў рэшце рэшт таксама зразумела: у гэтым выпадку ёсць усе падставы для абароны гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі супрацоўніка.

Сяргей ГРЫБ.

НЕ ВЫТРЫМАЛІ

Сярод белага дня на жыхара Лявхавічаў напалі двое і забралі залаты пярсцёнак. Рабаўнікамі аказаліся двое мясцовых жыхароў, якія адбываюць адміністрацыйны арышт. А цяпер атрымаюць «пад завязку».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Абзац

◢ У ноч на 18 лістапада з прычэпа аўтамабіля, прыпаркаванага каля ўзбочыны на трасе Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі непадалёк ад адной з вёсак у Талачынскім раёне, было скрадзена 248 скрыняў з філе рыбы. У кожнай скрыні знаходзілася каля 5 кг судака, а агульны кошт скрадзенай рыбы складаў амаль Br30 млн. Аб крадзяжы ў міліцыю паведаміў вадзіцель. Супрацоўнікі міліцыі вызначылі, што рыбу скраў раней судзімы мясцовы 29-гадовы жыхар. Падазроны затрыманы, груз вернуты гаспадару.

◢ **Малады мінчанін правярнуў аферу на Br10 млн з-за апантанасці гульнямі на аўтаматах. Ён прапаноўваў паслугі па рамонце мабільных тэлефонаў, але пасля таго, як сродак сувязі апынаўся ў яго руках, малады чалавек адразу ж збываў яго. Як мяркуюць праваахоўнікі, ён падмануў больш за 20 мінчан. Адной з прычын такіх паводзінаў стала заўзятасць да гульнявых аўтаматаў. Распачата некалькі крымінальных спраў.**

◢ У Днепрапятроўскай вобласці (Украіна) звязаны праваднікамі пасажыр выпаў з цягніка «Сімферопаль—Львоў» і атрымаў смяротныя траўмы. На адной невялікай станцыі ў цягнік сеў новы пасажыр і пачаў шчодра ўжываць спіртное — «на дарожку». Дайшоўшы да кандыцыі, ён стаў чапляцца да пасажыраў і нават біцца. Угаворы на яго не дзейнічалі, і тады праваднік паклікаў калегу з суседняга вагона, і разам яны звязалі дэбашыра і вынеслі ў тамбур «ахаладзіцца». У вагоне стала спакойна, аднак звязаны чалавек умудрыўся адчыніць дзверы вагона і, згубіўшы раўнавагу, выпаў на палатно. Па правілах праваднік павінен быў выклікаць міліцыю, але чамусьці гэты цягнік не ахоўваўся. Зараз 29-гадовы праваднік Віктар знаходзіцца ў следчым ізалятары, яму пагражае да 12 гадоў пазбаўлення волі.

Поўны абзац

◢ **Амерыканка выявіла ноччу ў сваім басейне... 250-кілаграмовую карову. Жыхарка Паўднёвай Караліны пачула на сваім двары моцны ўсплеск. Рыба, нават дробная, у яе басейне не вадзілася. Жанчына ўзяла ліхтарык, каб высветліць, што здарылася. У басейне плавала вялікая карова. Па выкліку прыехалі выратавальнікі. Пяць чалавек выцягнулі карову з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў. Высветлілася, што суседская рагуля адвязалася і гуляла па ваколіцах. Прыняўшы брызент, якім быў прыкрыты басейн, за цвёрдую паверхню, яна рушыла па ім і нечакана для сябе прыняла водныя працэдуры. Гаспадыня басейна спадзяецца, што страхоўка за дом пакрые затраты па рамонце басейна.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АНТЫРЭКАРДСМЕН

18 лістапада супрацоўнікамі ДАІ ў Гродзенскім раёне затрыманы 32-гадовы вадзіцель, які раней 27 разоў прыцягваўся да адказнасці за кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап`янення. Пасля пазбаўлення ў 1997 годзе за ваджэнне машыны ў п'яным выглядзе вадзіцельскага пасведчання, ён 49 разоў караўся за парушэнне Правілаў дарожнага руху. На гэты раз, знаходзячыся ў нецвярозым стане, на дарозе Гродна—Падлабенне ля паварота на вёску Адамавічы на «Форд-Эскорце» апынуўся ў кюветы. Дзякуй Богу, абышлося без пацярпелых.

Алег ДУК,
старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения – гаража № 100 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 8А (помещение транспортного назначения общей площадью 17,5 кв. м, инв. № 500/D-40654).

Начальная цена – 8 078 400 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 800 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **17 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 20.11.2009 по 15.12.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.
Сайт в интернете: www.mgcn.by

КОМПЛЕКС «МІНСКАЕ ЗАМЧЫШЧА» ПЛАНУЕЦЦА СТВАРЫЦЬ ДА 2013 ГОДА

У рамках рэканструкцыі гістарычнага цэнтра сталіцы плануецца стварыць гісторыка-археалагічны комплекс «Мінскае замчышча». Яго канцэпцыю распрацавалі спецыялісты УП «Мінскпраект». Аб'ект будзе складацца з трох частак. На месцы спарткомплексу «Працоўныя рэзервы», што ў пачатку праспекта Пераможцаў, створаць у натуральную велічыню макет фрагмента горада XII стагоддзя з уязной брамай, абарончымі валамі, храмам, вуліцамі і дамамі.

Бліжэй да ракі пабудуюць падземную залу-амфітэатр. Тут будуць дэманстравацца самыя каштоўныя археалагічныя знаходкі. Трэцяя частка комплексу, Ніжні рынак, размесціцца бліжэй да станцыі метро «Няміга». Гэта будзе новы аб'ект, які не будзе прэтэндаваць на гістарычную дакладнасць, а толькі выкарыстае матывы сярэдневяковага гарадскога рынку. Тут мяркуецца прадаваць сувеніры, прадметы мастацтва, наладжваць сезонныя пункты грамадскага харчавання, выступленні артыстаў, клоўнаў, фокуснікаў. На працягу наступнага года будуць весціся праектныя работы, а пабудаваць комплекс плануецца да 2013 года.

Вольга ЖАРЫНА,
«Мінск—Навіны».

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже двухэтажного кирпичного здания с инвентарным номером 500/С-17147 общей площадью 374,2 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, д. 5, корп. 6.

Начальная цена – 914 417 100 белорусских рублей. Площадь земельного участка 0,0739 га.

На продаваемое здание обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней и примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 90 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **17 декабря 2009 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 20.11.2009 по 15.12.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.
Сайт в интернете: www.mgcn.by

ПРОДАЮТСЯ АКЦИИ ПРОСТЫЕ (ОБЫКНОВЕННЫЕ) ЗАО «ВЫСТАВОЧНЫЙ ЦЕНТР «АКВАБЕЛ» МИНСКИЙ РАЙОН В КОЛИЧЕСТВЕ 74 ШТУК

Стоимость одной акции устанавливается в размере 470 000 долларов США для нерезидентов Республики Беларусь. Стоимость одной акции для резидентов Республики Беларусь равна сумме в белорусских рублях, эквивалентной 470 000 долларов США по курсу, который равен курсу продажи наличного доллара США в обменных пунктах ОАО «Белагропромбанк» на дату оплаты.

Преимущественное право на покупку указанных акций в течение определенного срока имеют акционеры и само Общество. Дополнительную информацию об условиях продажи акций и о ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район можно получить по телефонам: **+375 29 349 51 66 и +375 29 777 17 10.** Заявки на приобретение акций рассматриваются **до 10.12.2009 года.**

Адрес для направления заявок и иной почтовой корреспонденции: 220131, г. Минск, а/я 409.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 27 ноября 2009 года 93-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 14 ноября 2009 г.) целевое назначение лота № 44, позиция № 44 вместо «(для размещения автомата по продаже чая, шоколада и кофе)» **изложить «для размещения автомата по продаже горячих и холодных напитков, продуктов питания».**

Телефон для справок 227 40 22.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			**Республиканское унитарное предприятие «Волковысский завод кровельных и строительно-отделочных машин» (РУПП «Волковысский завод КСОМ»), Республиканское дочернее унитарное предприятие «Пралеска- Плюс» Республиканского унитарного предприятия «Волковысский завод кровельных и строительно-отделочных машин» (РДУП «Пралеска-Плюс» РУП «Волковысский завод КСОМ»), Министерство промышленности Республики Беларусь**	**Республиканское унитарное предприятие «Волковысский завод литейного оборудования» (РУП «ВЗЛО»), Министерство промышленности Республики Беларусь**
Адрес			231900, Гродненская область, г. Волковыск, ул. С. Панковой, 65	231900, Гродненская область, г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Производство строительных машин, общемашиностроительных узлов и деталей. Розничная торговля и общественное питание	Производство металлургического оборудования, производство строительных машин
Положение на рынке			Занимает доминирующее положение	Не занимает доминирующее положение
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39	Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39
Численность работающих, чел.			313	376
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			13 614 656 000	5 635 498 000
Стоимость основных фондов – всего, руб.			12 553 098 104	7 256 943 057
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			28,9625	16,85
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			6 735 360	31 611 021
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет	нет
Финансовое состояние объекта, руб.	**Балансовая прибыль**		132 480 975	431 000 000
	Задолженность	**кредиторская**	3 120 257 007	2 446 449 460
		дебиторская	182 236 160	258 485 781

УНП 100745627.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ

О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 33»

Номер лота	**ЛОТ № 1**
Наименование объекта	1.Здание АБК, состоящее из 3-этажного керамзитобетонного административного здания с 2-этажным керамзитобетонным зданием ремонтной мастерской с одноэтажным керамзитобетонным цехом субподрядных организаций (инв. № 122/С-13792). 2. Материальный склад (инв. № 122/С-13790). 3. Внутриплощадочные сети связи и сигнализации. 4. Внеплощадочные сети электроснабжения. 5. Внутриплощадочные сети водоснабжения и канализации. 6. Очистные сооружения мойки машин. 7. Железобетонное ограждение территории.
Местонахождение объекта	Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, д. 1
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Строительный трест № 33»
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление
Начальная цена продажи, руб. без НДС	**1 087 644 593**
Размер задатка, руб	**32 629 338**
Право на земельный участок	3,2372 после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ
Тип и характеристика объекта	1. Здание АБК (инв. № 122/С-13792), общ. пл. 2762,7 м², объем 16186 м³, 1991 г.п. – фундамент – блоки; стены – керамзитные панели; перекрытия – ж/б плиты; крыша – совмещенная рулонная; полы – дощатые, плитка, линолеум, бетон; проемы оконные – деревянные, дверные – простые щитовые, фанерованные; внутр. отделка – оштукатурено, побелено, окрашено; отопление – стальные трубы; электроснабжение – проводка скрытая, открытая; водопровод – стальные трубы; канализация – чугунные трубы. 2. Материальный склад (инв. № 122/С-13790), общ. пл. 716,5 м², объем 5730 м³ – фундамент – блоки; стены – керамзитные панели; перекрытия – ж/б плиты; крыша – совмещенная рулонная; полы – бетонные; проемы оконные – стеклоблоки, дверные – простые, деревянные ворота; электроснабжение – проводка открытая. 3. Внутриплощадочные сети связи и сигнализации, протяж. 80 м. 4. Внеплощадочные сети электроснабжения, протяж. 2327 м. 5. Внутриплощадочные сети водоснабжения и канализации, протяж. 427,4 м. 6. Очистные сооружения мойки машин, камера 11,05х1,58 м ж/б монолит. 7. Железобетонное ограждение территории, протяж. 619,9 м.п.
Условия продажи	без условий
Условия оплаты	оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/сч для перечисления задатка	р/сч 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл, код 153001331, УНП 102353509

Аукцион состоится 22 декабря 2009 г. в 12.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, «РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление»

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 18 % от продажной цены объекта, стоимость комиссионного вознаграждения организатору аукциона в размере 2 % от продажной цены объекта.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 21 декабря 2009 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ПИНСКРАЙАГРОСЕРВИС»

Номер лота	**ЛОТ № 1**	
Наименование объекта	**1. Здание бокса для хранения зерноуборочных комбайнов, включая переходную галерею (инв. № 130/С-36447), общ. пл. 1897,8 м², объем 15 319 м³, 2003 г.п.**	
Местонахождение объекта	Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Солнечная, 3/1	
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Пинскрайагросервис»	
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление	
Начальная цена продажи, руб. без НДС	**484 000 000**	
Размер задатка, руб	**48 400 000**	
Право на земельный участок	0,3095	после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ
Тип и характеристика объекта	Одноэтажное панельное здание 2003 года постройки. Фундамент бетонный, стены ж/б панели, перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная, полы бетонные, проемы простые. Переходная галлерея: фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия ж/б, полы бетонные; проемы и кровля отсутствуют.	
Условия продажи	с условиями	
Условия оплаты	оплата производится в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов	
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов	
Номер р/сч для перечисления задатка	р/сч 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл, код 153001331 УНП 102353509	

Аукцион состоится 21 декабря 2009 г. в 12.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление»

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2.

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

20 ЛІСТАПАДА 2009 г. ПЯТНІЦА № 44 (15598)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Акцыя

«КУРЫЦЬ НЕ МОДНА! МОДНА — НЕ КУРЫЦЬ!»

КУРЭННЕ — сацыяльная праблема. Гэта згубная звычка забірае кожнага дзясятага чалавека ў свеце. Згодна з інфармацыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожны год у свеце ад курэння паміраюць амаль 5 з паловай мільёнаў чалавек. Да 2030 года гэта лічба перавысіць 8 мільёнаў. І, безумоўна, гэту праблему не маглі абмінуць актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. На працягу 8 дзён яны праводзілі Моладзевы марафон «Формула Будучага: Моладзь + Здароўе». Фінішавала акцыя напярэдадні. Яе вынікі падводзіць сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ДАЛЖЭЎСКІ.

— БРСМ надае вялікую ўвагу прапагандзе здаровага ладу жыцця. І невыпадкова было прынята рашэнне аб правядзенні моладзевага марафону «Формула Будучага: Моладзь + Здароўе». Яго асноўная задача — апрабацыя новых форм грамадскай дзейнасці моладзі, арганізацыя вольнага часу юнакоў і дзяўчат, папулярызацыя заняткаў фізічнай культурай і спортам, развіццё моладзевых ініцыятыў. За 8 дзён марафону былі арганізаваны лекцыі і канферэнцыі, акцыі «Дні без цыгарэт!», тэматычныя радыёперадачы, конкурсы малюнкаў, фатаграфій, тэатралізаваныя прадстаўленні, спартыўныя спаборніцтвы, канцэрты і дыскатэкі. А 19 лістапада, у Сусветны дзень некурэння, БРСМ правёў ва ўсіх рэгіёнах дні без курэння. Асабліва хочацца расказаць, як фінішаваў праект у Мінску, у гандлёвым цэнтры «Сталіца», дзе кожны ахвотнік змог не толькі «забіць на цыгарэту», але і прыняць удзел у «судзе над тытунем». У прыватнасці, моладзевы «Антытытунёвы дэсант» абвясціў абструкцыю заўзятым курцам. У адно імгненне чалавека, які закурыў на аўтобусным прыпынку, са словамі «Вы курыце? Курыце-курыце, мы пацерпім!» акружалі юнакі і дзяўчаты, якія затым дэманстратыўна надзявалі на сябе процівагазы, паказваючы такім чынам свой пратэст супраць шкоднай звычкі і забруджвання навакольнага асяроддзя. Па задуме маладых людзей, калі курэц ад сораму не ўцякаў, яны расказвалі яму аб шкодзе тытунёвага дыму і ўручалі «Памятку курца». А на пляцоўцы пад цэнтральным купалам супермаркета актывісты БРСМ арганізавалі своеасаблівы «Кірмаш здароўя». Напрыклад, удзельнікі акцыі маглі «Забіць на цыгарэту», убіўшы ў стылізаванае пад цыгарэту бярвяно вялізны цвік. Акрамя таго, на ўласныя вочы ўбачыць, як «вялізная імправізаваная мясарубка» здрабніць тытунёвыя вырабы, сабраныя моладдзю з 11 па 19 лістапада падчас акцыі «Абмяняй цыгарэту на цукерку». Хочацца яшчэ прыгадаць акцыю «Сок-шоу». Падчас яе арганізатары пад дэвізам: «Той, хто сок фруктовы п'е, стройны будзе і высокі, а той, хто піва папівае, той хваробы збірае!». Спаборніцтва прайшло ў два этапы: удзельнікі стваралі лепшы слоган на сок- ці антытытунёвую тэму, затым атрымлівалі задавальненне ад уцягвання соку праз саломінку. Пераможца заваяваў тытул «Круты сок-шоумен». Ацаніць «ступень свайго здароўя» ўсім удзельнікам моладзевага праекта дапамаглі актывісты пярвічнай арганізацыі, студэнты Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. На адным з узроўняў ТЦ «Сталіца» яны арганізавалі работу перасоўнай «Лабараторыі здароўя». Будучыя медыкі прапанавалі не толькі вымераць вагу, рост, артэрыяльны ціск, аб'ём лёгкіх, сілу рук, але і атрымаць інфармацыю аб утрыманні ў крыві алкаголю. Спадзяюся, што такія мерапрыемствы будуць мець добрыя вынікі, каб у краіне было як мага больш моцных, дужых маладых людзей і ўвогуле паспрыяюць выхаванню агульнай маральнай культуры, зніжэнню дынамікі спажывання тытуню, алкаголю, наркотыкаў сярод моладзі.

— Чаму вырашылі звярнуць увагу менавіта на курэнне?

— Хачу прыгадаць жудасныя лічбы, якія ў многіх на слыху. Практычна кожныя 15 хвілін ва ўсім свеце тысячы людзей гінуць ад курэння. Асабліва калі гэта пачынаецца яшчэ са школы. Каля навучальных устаноў мы часта бачым юнакоў і дзяўчат, якія кураць. І наш саюз не можа пакінуць гэту праблему без увагі.

— На вашу думку, такія акцыі здольны змяніць стаўленне маладых да цыгарэт?

— Любы чалавек у першую чаргу павінен усведаміць шкоду курэння, але лепш за ўсё, калі ён убачыць гэта на ўласныя вочы. Таму невыпадкова падчас марафону былі выстаўлены жудасныя фотаздымкі лёгкіх, розных захворванняў скуры, выкліканых курэннем. Дрэнна, што ў сваёй большасці мы ў поўнай ступені ўсведамляем шкоду курэння не ў маладым узросце, а, калі нам далёка за 50. Але, як кажуць, цягнік ужо пайшоў. Прыступаць да здаровага ладу жыцця лепш цяпер, пакуль малады.

— Такія марафоны — гэта ж не адзінкавыя акцыі, якія ладзіць БРСМ на працягу года?

— Нішто не дае высокіх вынікаў, калі гэта разавае мерапрыемства. Правядзенне такіх акцый запісана ў нашых планах. Але самую вялікую ўвагу надаём менавіта ў Сусветны дзень адмовы ад курэння. Ну і мы заўсёды заклікаем нашых членаў сваім прыкладам паказваць, што курыць шкодна. І не толькі курыць, але і піць, ужываць наркотыкі.

— Як вы заўважаеце, з кожным годам удзельнікаў падобных форумаў становіцца больш?

— Удзельнікаў многа. Прыходзяць маладыя людзі. Хтосьці з цікавасці, камусьці прыкольна абмяняць цыгарэту на цукерку і потым пра гэта ўзгадваць. Спадзяюся, што такія форумы дазволяць маладым людзям задумацца пра сваё здароўе і кінуць курыць.

Тое, што тытунь становіцца прычынай развіцця ракавых пухлін, розных захворванняў органаў дыхання, ні для каго не сакрэт. Праўда, гэты факт мала каго спыняе. Усе чамусьці перакананыя, што менавіта іх хвароба не закране. Нягледзячы на тое, што Сусветны дзень адмовы ад курэння ўжо прайшоў, кожны з амаратараў падыміць можа адмовіцца ад гэтай шкоднай звычкі і сёння, і заўтра...

Святлана СУХАРКО.

Студэнцкая ініцыятыва

АСОБНЫ КРЭДЫТ ДЛЯ ТАЛЕНАВІТЫХ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ

Усім вядома, што вестак аб павышэнні стыпендыі студэнты чакаюць з асаблівай нецярплівасцю. Жыццё пастаянна даражэе, а грошай у кішэні не дабаўляецца. На апошняй сустрэчы студэнцкага актыву з міністрам адукацыі Аляксандрам Радзьковым, якая адбылася ў Міжнародны дзень студэнтаў у сценах БДУІР, маладыя людзі таксама пацікавіліся перспектывамі павышэння сваіх «даходаў». Але ніякай абнадзейвальнай інфармацыі Аляксандр Радзькоў паведаміць ім не змог, паколькі павелічэнне вучэбных стыпендый ажыццяўляецца толькі пасля павелічэння тарыфнай стаўкі першага разраду.

Трэба зазначыць, што сустрэчы міністра адукацыі з прадстаўнікамі студэнцкага актыву вышэйшых навучальных устаноў паспелі ператварыцца ўжо ў добрую традыцыю. Прычым нават цяжка вызначыць, для каго яны больш карысныя: для маладых людзей, якія асабіста могуць задаць прадстаўнікам Міністэрства адукацыі хвалюючае іх пытанне ці для кіраўнікоў міністэрства, у якіх з'яўляецца ўнікальная магчымасць убачыць тую ці іншую надзённую праблему вачамі самай крытычна настроенай, ініцыятыўнай і сацыяльна актыўнай часткі беларускага грамадства.

— Нярэдка пытанні, якія ўзнімае моладзь, настолькі вострыя, што мы вымушаны рэагаваць на іх неадкладна, — прызнаўся Аляксандр Радзькоў. — Напрыклад, студэнты ініцыявалі распаўсюдзіць права на атрыманне жылля ў аграгарадках не толькі на спецыялістаў сельскай гаспадаркі, але і на настаўнікаў і ўрачоў. Міністэрства адукацыі ініцыявала адпаведнае рашэнне ўрада, і цяпер уласнымі дамкамі забяспечваюцца і маладыя медыкі, і механізатары. На адной з апошніх сустрэч студэнты пацікавіліся, чаму выпускнікі, якія атрымлівалі адукацыю на платнай аснове і пажадалі размеркавацца, не карыстаюцца тымі гарантыямі і прывілеямі, якія распаўсюджваюцца на маладых спецыялістаў — іх аднакурснікаў, што навучаліся за бюджэтныя сродкі. Гэта была цалкам справядлівая заўвага, таму што для арганізацый, якім востра патрабуецца той ці іншы спецыяліст, абсалютна не мае значэння, сам выпускнік аплачваў сваё навучанне або за яго гэта рабіла дзяржава. Галоўнае, што ёсць жаданне выпускніка працаваць у прапанаваных яму ўмовах. Таму хачу вас праінфармаваць, што гэта несправядлівасць ужо ліквідаваная, і сёння маладымі спецыялістамі лічацца не толькі размеркаваныя «бюджэтнікі», але і студэнты платнай формы навучання, якія прыступілі да работы па размеркаванні. Адпаведна на іх распаўсюджваюцца і ўсе прадугледжаныя ў Палажэнні аб размеркаванні гарантыі для маладых спецыялістаў...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міністр прызнаўся студэнтам, што ён вельмі занепакоены стратай якасці фундаментальных ведаў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, асабліва па прыродазнаўчых, інжынерных і медыцынскіх спецыяльнасцях.

— У тэхнічных універсітэтах фізіку і «сапрамат» проста не заўважаюць, а калісьці адлічваліся прыкладна 10 працэнтаў студэнтаў, якія не маглі здаць экзамен па супраціўленні матэрыялаў. Гэта веды, без якіх інжынеру проста немагчыма абысціся, — падзяліўся сваімі думкамі Аляксандр Радзькоў. — Я праводзіў нараду з вядучым псіхолагамі нашай краіны (дактарамі навук і прафесарамі), паколькі занепакоены адсутнасцю вынікаў дзейнасці службы практычнай сацыяльнай псіхалогіі, якая існуе ўжо 20 гадоў. Вырашыў пацікавіцца ў іх, а якія дысцыпліны з'яўляюцца фундаментальнымі ў падрыхтоўцы псіхолага? Павісла доўгая паўза. Затым мне адказваюць: «Агульная псіхалогія». Якая агульная псіхалогія? Агульная псіхалогія — гэта спецыяльная дысцыпліна. Чаму паважаныя спецыялісты не згадалі біялогію ці фізіялогію?

Яшчэ адна праблема — спалучэнне ў вучэбным працэсе розных сродкаў навучання. Колькі часу павінна адводзіцца на лекцыі, лабараторныя заняткі, самастойную работу і практыку?

— Замежныя студэнты, якія прыязджаюць да нас па праграмах міжнароднага абмену, застаюцца вельмі незадаволеныя тым, як арганізавана ў нас практыка на вытворчасці, — прызнаўся міністр. — Мяне хвалюе таксама і тая акалічнасць, што год ад году колькасць маладых людзей, якія хочуць звязаць сваё жыццё з навуковай дзейнасцю і вышэйшай школай, працягвае змяншацца. Мы нават не змаглі запоўніць сёлета месцы ў аспірантуры. А канідацкія дысертацыі на выхадзе з аспірантуры абараняюць толькі 1 працэнт выпускнікоў (раней было 8 працэнтаў). У савецкія часы навучанне ў аспірантуры было абавязковым атрыбутам сацыяльнага поспеху, а сёння атрыбуты поспеху ў моладзі — зусім іншыя. Я гэта добра разумею. Разумею таксама, што ніколі навукоўца ці дзяржаўны служачы не будуць зарабляць столькі ж, колькі бізнэсмен, таму ў аспірантуру трэба прыцягваць тых маладых людзей, якія з'яўляюцца даследчыкамі па сваёй сутнасці.

На жаль, памер заработнай платы маладых выкладчыкаў і навукоўцаў не дазваляе назваць нашы ВНУ і навуковыя арганізацыі прыцягальным варыянтам працаўладкавання для таленавітай моладзі. Да таго ж ён значна ніжэйшы нават за аспіранцкую стыпендыю. А многім жа выпускнікам даводзіцца ўтрымліваць свае сем'і... Варта дадаць, што на выпускнікоў аспірантуры не распаўсюджваюцца прэферэнцыі, вызначаныя для маладых спецыялістаў. Такім чынам выпускнік аспірантуры атрымлівае толькі пасведчанне аб здачы кандыдацкіх экзаменаў, а затым яго веды «сплываюць у пясок», таму што замест працягу навуковай работы і падрыхтоўкі дысертацыі яны вымушаны працаўладкоўвацца там, дзе яму будуць плаціць больш-менш годныя грошы.

Студэнт 5-га курса аграэнергетычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Яўген Рак падзяліўся сваім бачаннем праблемы маладых навукоўцаў: «Я лічу, што забеспячэнне маладых навукоўцаў жыллём павінна ажыццяўляцца не ў масавым, а ў індывідуальным парадку. Калі малады навукоўца ў год заканчэння аспірантуры абараняе кандыдацкую дысертацыю, то ніколі навукоўцы ўласныя распрацоўкі, пацверджаныя патэнтамі, друкаваныя артыкулы, то ён павінен заахвочвацца з боку дзяржавы выдзяленнем жылля на аснове спецыяльных умоў. Прычым для вырашэння гэтай праблемы неабходна прыцягваць сродкі як рэспубліканскага, так і мясцовага бюджэтаў, у прыватнасці, Мінгарвыканкама. Да таго ж з прычыны дастаткова нізкай заработнай платы большасці маладых навукоўцаў хацелася б, каб была распрацавана спецыяльная банкаўская праграма па крэдытаванні будаўніцтва жылля «Жыллё для таленавітых маладых навукоўцаў» з паніжанымі крэдытнымі стаўкамі. Застаецца нявырашаным і пытанне з прававой абаронай інтэлектуальнай уласнасці. Напрыклад, прадпрыемства, якое выкарыстоўвае распрацоўкі, пацверджаныя патэнтамі, рэдка забяспечвае інфармацыяй аб колькасці прадукцыі, прададзенай на рынку і вырабленай па гэтых інавацыях. Між іншым, ад колькасці рэалізаванай прадукцыі залежыць памер ганарараў яе распрацоўшчыкаў». На пытанне міністра, а ці плануеш ты сам ісці ў аспірантуру, хлопец упэўнена даў станоўчы адказ, чым яўна яго парадаваў .

Начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталь Брэль расказаў, што ў снежні плануецца здаць першы інтэрнат у студэнцкай вёсцы ў раёне праспекта Дзяржынскага, дзе ўжо завяршаюцца апрацоўчыя работы. Шчаслівымі навасельцамі стануць студэнты БДУ. Праекціроўшчыкі прадугледзелі ўсе дробязі, каб студэнты маглі адчуваць сябе як дома. У кожным блоку па два пакоі: адзін, плошчай 14 квадратных метраў, разлічаны на двух жыльцоў, а другі, плошчай 21 квадратны метр, — на траіх маладых людзей. У кожным блоку будзе кухня з халадзільнікам і электраплітой, душавая і прыбіральня. А ў кожным пакоі прадугледжана лакальная сетка з выхадам у інтэрнэт — гэта вялікая перавага для навучэнскай моладзі. Усяго пад студэнцкую вёску адведзена плошча ў 40 гектараў. Акрамя інтэрнатаў, разлічаных на засяленне 11 тысяч чалавек, у студгарадку будуць свая паліклініка, свой фізкультурна-аздараўленчы комплекс, шматфункцыянальны культурна-забаўляльны цэнтр, якія праектуюцца па самых высокіх стандартах.

На адной з сустрэч студэнцкай моладзі з міністрам прагучала цікавая ініцыятыва — стварыць студэнцкі «бізнэс-інкубатар», ці цэнтр моладзевых ідэй. Такі цэнтр ужо працуе пры Мінгарвыканкаме, запэўніў міністр. А пры Мінскім гарадскім савеце дэпутатаў дзейнічае моладзевая палата. Моладзевай палатай першага склікання былі агучаны і атрымалі падтрымку гарадскіх уладаў, напрыклад, такія прапановы, як стварэнне ў гарадзе пляцовак для заняткаў экстрэмальнымі відамі спорту, а таксама зніжэнне ўзроставага цэнзу для наведвальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі з 16 да 14 гадоў. У кастрычніку прайшлі выбары ў моладзевую палату другога склікання — усяго было абрана 55 дэпутатаў. А першае пасяджэнне моладзевай палаты ў новым яе складзе адбудзецца ўжо напрыканцы лістапада...

Надзея НІКАЛАЕВА.

СЯМЕЙНЫ ГАРМІДАР

Пад такой назвай у аграрным гарадку Сакалішча Расонскага раёна ўпершыню прайшло свята сярод вясковай сямейнай моладзі. Шэсць маладых сямейных пар з розных вёсак удзельнічалі ў жартоўных, забаўляльных і спартыўных конкурсах. Пераможцы атрымалі памятныя падарункі ад райкама БРСМ. А галоўнае — весела бавілі час, пазнаёміліся, пасябравалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАВІЛЫ ЯК ЯНЫ ЁСЦЬ

Каму з нас не шчасціла тым ці іншым чынам трапіць у студэнцкі інтэрнат: ці на засяленне падчас навучання ва ўніверсітэце, ці проста ў госці да сяброўкі на дзень народзінаў... Менавіта тут, у гэтых сценах, магчыма адчуць атмасферу сапраўднага сяброўства, якое можа застацца на ўсё жыццё, і правесці самыя непаўторныя, а гэта дакладна, і вясёлыя хвіліны сваёй маладосці, калі не ўсяго жыцця наогул. І не трэба спрабаваць аднеквацца, кідаючыся выразамі тыпу «Я нідзе ніколі не сяўціўся». Такія адмоўкі выкарыстоўваюць толькі для душэўнага спакою нашых бацькоў, якія самі паспрабавалі ўсе гэтыя інтэрнацкія «прыемнасці», і здзівіць ці засмуціць іх наўрад ці змогуць. На тое яны і студэнцкія гады, а тым больш жыццё ў інтэрнаце.

Не заўсёды сяброўскія пасядзелкі ў пакоі падчас таго ці іншага свята заканчваюцца без праблем. Я маю на ўвазе студэнцкі савет ці вымову, якія звычайна пераследуюць інтэрнацкія мерапрыемствы, што выйшлі за межы дазволенага, дапушчальнага афіцыйнымі прававымі нормамі навучальнай установы. А без такіх акалічнасцяў не застаецца не адно свята, праведзенае ў сценах інтэрната.

Менавіта гэтыя нормы, правілы мяне і зацікавілі. Жыву ў інтэрнаце ўжо пяць гадоў, а неабходныя прававыя дакументы так дакладна і не перачытала. І чамусьці заўсёды праходжу міма тых стэндаў, дзе можна было б хоць адным вокам глянуць на правы і абавязкі таго, хто размясціўся ў студэнцкім інтэрнаце. Па кансультацыю аб неабходнай інфармацыі я звярнулася да **старшыні студэнцкага савета аднаго з інтэрнатаў БДПУ імя Максіма Танка ПАЎЛОЎСКАЙ Вольгі**, студэнткі 3-га курса. Гэтую пасаду яна займае крыху больш за год, але раней Вольга была старастай паверха таго інтэрната, дзе жыла і студэнцкі савет якога ўзначальвае цяпер.

— Вольга, скажы, калі ласка, за што могуць выгнаць з інтэрната? Выселіць ды яшчэ і ў наступным годзе не даць месца?

— Існуе загад рэктара ўніверсітэта, у якім усё па пунктах прапісана і распісана. Выпіскі з яго звычайна вывешваюцца на відным месцы непасрэдна ў самім інтэрнаце ці дзесьці на факультэце. Я раю ўсім уважліва з імі пазнаёміцца, каб потым не аказацца ў непрыемнай сітуацыі.

— Прывядзі некалькі прыкладаў гэтых самых сітуацый. Чаго нельга рабіць, знаходзячыся ў межах інтэрната?

— Па-першае, паліць. Па-другое, распіваць спіртныя напоі, ужываць наркатычныя і псіхатропныя рэчывы. Па-трэцяе, стварацьшум, які перашкаджае суседзям.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

СТЫПЕНДЫЯТЫ ФОНДУ ТЭНІСНАЙ «ЗОРКІ»

Студэнтка першага курса гуманітарнага факультэта БДУ Святлана Вараб'ёва стала першай стыпендыяткай Фонду Марыі Шарапавай ад Беларусі.

«Зорка» сусветнага тэніса Марыя Шарапава з'яўляецца Паслом добрай волі ААН, а праграма стыпендый Фонду Марыі Шарапавай разлічана на падтрымку таленавітай моладзі з раёнаў Беларусі, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Акрамя студэнткі БДУ стыпендыі будуць выплачвацца таксама і двум студэнтам Беларускай акадэміі мастацтваў. Стыпендыяты выбіраліся з кола прэтэндэнтаў па такіх крытэрыях, як дасягненні ў вучобе і творчыя перспектывы. Святлана Вараб'ёва родам з Чавусаў Магілёўскай вобласці. У гэтым годзе яна паступіла ў БДУ на гуманітарны факультэт, на спецыяльнасць «культуралогія», спецыялізацыя «германістыка і нямецкая мова». Яна закончыла таксама з адзнакай музычную школу, мае дыпломы прызёра розных алімпіяд і конкурсаў, у прыватнасці, раённай алімпіяды па нямецкай мове і Рэспубліканскага моладзевага конкурсу, прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Святлана піша вершы і музыку.

На працягу першых чатырох гадоў рэалізацыі стыпендыяльнай праграмы, агульны аб'ём фінансавання якой складае 210 тысяч долараў, будзе прызначана 12 стыпендый для беларускіх студэнтаў. Раней з Фонду Марыі Шарапавай было выдаткавана 100 тысяч долараў для падтрымкі сямі праектаў ПРААН, скіраваных на аказанне дапамогі моладзі з пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі тэрыторый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФУТБОЛЬНЫЯ МЕТАМАРФОЗЫ

Галоўны трэнер мінскага «Дынама» распавёў нам пра псіхолага Капэла, іспанскае пераўвасабленне і шчырасць Светлакова

ЗМЕНЫ ў нашым жыцці часам бываюць настолькі непаслядоўнымі, кардынальнымі, што толькі і застаецца здзіўляцца, як з чалавекам магло здарыцца такое. Шматлікія беларускія балельшчыкі дагэтуль не могуць зразумець, чаму лепшы футбаліст маскоўскага «Лакаматыва» замест таго, каб працягнуць кар'еру ў Расіі, пераехаў жыць і гуляць у Беларусь, а пасля пачаў трэніраваць мінскую каманду. Але ж Сяргей Гурэнка, адзін з самых тытулаваных футбалістаў Беларусі, ужо піша новую старонку ўласнай кар'еры і, напэўна, знаходзіцца далёка ад падобных роздумаў. Яго перш-наперш клапоцяць сям'я, здароўе футбалістаў «Дынама», і, мабыць ужо, будучы чэмпіянат краіны. А мінулае? Калі цікава, то ўзгадаем...

Масква — Мінск

Сталічныя вуліцы ізноў пакутуюць ад прыгодаў капрызлівага надвор'я. Але ж мінакі, відаць, звыкліся з падобнымі выбрыкамі прыроды і хаваюцца пад парасонамі ад калючага дажджу і ветру. Я хуценька саджуся ў надзейнае аўто Сяргея Гурэнкі. На размову ў нас ёсць прыкладна гадзіна. Пасля ў «Дынама» — чарговая трэніроўка. Былы капітан нацыянальнай зборнай ужо прыкладна год жыве ў Мінску. Спачатку сваёй надзейнай гульнёй на полі ён дапамагаў маладым «дынамаўцам», а цяпер сочыць за матчамі каманды з трэнерскай пазіцыі. І пакуль, як паказваюць вынікі чарговага першынства Беларусі, робіць гэта ўдала. Каманда пад яго кіраўніцтвам скончыла сезон на другім месцы.

— Сяргей, год таму вы пераехалі ў Мінск, а дагэтуль доўга жылі ў Маскве. Ніякіх праблем у бытавым плане за гэты час не ўзнікала?

— Ды не. Тут усё значна прасцей, чым у Маскве. І рытм жыцця ў Мінску мяне цалкам задавальняе. Безумоўна, узнікаюць нейкія пытанні, але ж гэта дробязі.

— А ці не пакрыўдзіліся раптам на вас гродзенскія сябры, што вось, маўляў, забыўся на родны горад і паехаў завяршаць кар'еру ў Мінск?

— Па-першае, я ўжо даўно не жыву ў Гродне, а па-другое, гуляць заўжды хочацца там, дзе ставяць высокія мэты. Зразумела, што «Нёман» цяпер не такі амбіцыйны клуб, як «Дынама». Менавіта таму, сыходзячы з гэтых высноваў, я і прыняў прапанову сталічнай каманды.

— А якія пазітыўныя моманты, акрамя спартыўных, вы бачыце ў вяртанні на Радзіму?

— Перш за ўсё, я часцей бачу сваю сям'ю: жонку і сыноў Арцёма і Мікіту. Яны, дарэчы, таксама займаюцца футболам. Праўда, у розных спартыўных школах. Пакуль ім падабаецца, аднак я не стаўлю перад сынамі задачы стаць вядомымі футбалістамі. Дарэчы, падобнай мэты ў мяне таксама не было, калі толькі пачынаў, так усё атрымалася ў жыцці...

Дарэчы, бацька Сяргея ў маладосці актыўна займаўся хакеем. І нават былі ў яго нядрэнныя перспектывы. Аднак у Гродне, куды сям'я Гурэнкаў пераехала на сталае месца жыхарства з Расіі, хакей не быў прыярытэтным відам спорту. Затое тут любілі футбол! І стадыён на матчах роднага «Хіміка» звычайна гудзеў, як пчаліны вулей. Віталь Гурэнка зацікавіўся гульнёй і амаль на кожны матч прыходзіў з маленькім Сяргеем. Тады ён яшчэ не ведаў, што прыйдзе час, і ўвесь горад будзе ганарыцца яго сынам — таленавітым футбалістам...

— Я пачаў гуляць у футбол у сваім дварэ, — узгадвае за рулём Сяргей Гурэнка. — Мне вельмі падабалася гуляць са старэйшымі хлопцамі, але ж гэта быў пачатковы, самадзейны ўзровень. Аднак пазней да нас у школу прыйшоў дзіцячы трэнер, Юры Фёдараў, запрыкмеціў мяне, і з таго часу я сур'ёзна, актыўна пачаў займацца футболам. У «Хімік» я ўпершыню трапіў яшчэ ў 1988 годзе, калі каманда пасялася ў Кішынёў. У складзе каманды не хапала гульцоў, і нас, маладых, на ўсялякі выпадак запрасілі ў склад.

— Праз пяць гадоў вы завалодалі Кубкам Беларусі. Што дапамагло перамагчы? Можа, фантастычны камандны дух, які панаваў у «Хіміку»? Усё ж такі большасць футбалістаў былі гродзенцамі і даўно ведалі адно аднаго.

— Атмасфера ў калектыве сапраўды была добрая. Я ўзгадваю ўсё той жа выезд у Кішынёў. Памятаю, як пасля гульні мы сабраліся разам у пакоі, жартавалі, аналізавалі матч і не разбегліся ж ад крыўды! Вось гэта паказчык, калі каманда важнейшая за асабістыя стасункі. А што да перамогі ў Кубку Беларусі, то яе, на мой погляд, мы дабіліся дзякуючы ветэранам клуба: Сяргею Саладоўнікаву, Сяргею Карозу і Юрыю Мазурчыку. Гэтае атакуючае трыа і дасягнула перамогі.

— На пачатку дзевяностых вы скарылі не толькі спартыўныя вяршыні, але ж і геаграфічныя. Я маю на ўвазе пераход цераз швейцарскія Альпы...

— І мы, відаць, другія пасля Суворава, хто гэта зрабіў *(усміхаецца)*. Ведаеце, тады гэта выклікала ўсмешку, толькі цяпер зразумелая ўся небяспека сітуацыі. У матчах Еўракубка мы павінны былі гуляць са швейцарскім «Лугана». Вырашылі ехаць аўтобусам. Аднак увесь час мы з'язджалі з крутога горнага схілу і неўзабаве ў аўтобуса трэснула кола. Добра, што жывымі засталіся. Пасля такой цяжкай дарогі мы саступілі гаспадарам 0:5, аднак дома перамаглі 2:1.

— Вам цяпер не хапае той «нёманаўскай» згуртаванасці?

— Усё ж залежыць ад трэнера. І калі ён здолее заразіць футбалістаў агульнай мэтай, будзе мець з імі добрыя стасункі, то ўсё будзе добра ў калектыве.

— Дарэчы, Сяргей, вы ставіце да гульцоў такія ж патрабаванні, як і да сябе, калі былі футбалістам?

— Безумоўна. Спачатку гульцоў больш шкадуеш, але ж з часам гэта праходзіць. І тады пачынаеш патрабаваць ад іх многага і перш-наперш ахвоты, упэўненасці і самаахвярнасці.

— У айчынным футболе сёння актуальная праблема ўзаемадзеяння клубаў і агентаў. Галоўны трэнер жодзінскага «Тарпеда» неяк сказаў, што футбольны агент — гэта галаўны боль для спецыялістаў. Дарэчы, і на дысцыпліну футбалістаў адносіны з агентамі ўплываюць...

— Праблема, хутчэй за ўсё, не ў гульцах, а ў агентах. Я яшчэ не бачыў у нас агента, які растлумачыў бы хлопцу, як правільна харчавацца, набыў бы яму буцы, цікавіўся б, як ідзе жыццё ў школе, ва ўніверсітэце. Я не бачыў агента, які стаў бы для футбаліста другім бацькам. Яны імкнуцца атрымаць падрыхтаванага гульца і хуценька прадаць яго. Іх задача — пазабіваць нечым галовы бацькоў і пасля развесці іх. У мяне першы агент з'явіўся толькі ў Італіі, калі неабходна было вырашаць не толькі футбольныя, але і бытавыя пытанні. І ён сапраўды дапамог. Але ж нашыя агенты не падобныя на замежных. Таму і ўзнікаюць такія праблемы. Агент дапаможа футбалісту падпісаць дамову і ўсё, наступным разам ён з'явіцца толькі тады, калі ў гульца будзе заканчвацца кантракт...

— Доўгі час вы выступалі за маскоўскі «Лакаматыў». Ці адчулі на сабе ўплыў Юрыя Сёміна?

— Я працаваў з рознымі трэнерамі. Яначкін, Сёмін, Капэла, Сакі, Рахімаў, Бышавец... І мне здаецца, што ад кожнага я ўзяў нешта карыснае для сябе, нешта ад гэтых спецыялістаў засталося ў маім сэрцы...

— Вы ўжо трэці чалавек з каманды Сёміна, які пачаў займацца трэнерскай дзейнасцю. Спачатку Аўчыннікаў у «Кубані», пасля Чугайнаў у «Хімках»...

— Так, я ведаю. Кожны вырашае для сябе. Але ж і без уплыву Сёміна тут не абышлося.

— Ці захаваліся ў вас сяброўскія адносіны з кім-небудзь з футбалістаў старога «Лока», з якім вы толькі пачыналі ўзбірацца на футбольны Алімп?

— Амаль з кожным у мяне захаваліся таварыскія адносіны. Амаль да кожнага я магу звярнуцца па параду, але ж нашае сяброўства з былым абаронцам «Лакаматыва» Юрыем Драздовым праверана часам і рознымі жыццёвымі выпрабаваннямі.

Урок псіхолага

Пасля пяці сезонаў у «Лакаматыве» Сяргей пераехаў у італьянскую «Рому», якую тады ўзначальваў вядомы ўсім Фабіа Капэла. Гэтая навіна, як выбух, узрушыла беларускіх і рускіх балельшчыкаў. Да Гурэнкі толькі іншы Сяргей — Алейнікаў выступаў у Італіі. Але ж гэта было на пачатку дзевяностых, а цяпер усе жылі ў прадчуванні міленіума. За «магічных» Сяргей правёў каля дзесяці матчаў, аднак футбалістам асноўнага складу наш абаронца так і не стаў...

— Мая памылка была ў тым, — разважае Гурэнка, — што я празмерна адказна ставіўся да працы. Дагэтуль я ніколі не сядзеў на лаўцы запасных. І, вядома ж, мне хацелася даказаць трэнеру, што я не горшы за іншых. Я шмат трэніраваўся, думаў толькі пра футбол.

Я жыў пачуццямі, а разважлівасць адышла на другі план. Толькі пазней я зразумеў, што мне не хапала тактычных ведаў, упэўненасці. А на маёй пазіцыі гулялі два чэмпіёны свету: Кафу і Кандэла, сапраўдныя прафесіяналы, якія маральна былі падрыхтаваныя да любой сітуацыі. Неяк падчас размовы вядомы трэнер Капэла сказаў мне: «Не спяшайся, твой час яшчэ прыйдзе». Мне здаецца, што гэтыя словы добра дапамаглі мне пазней.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Рэверс з Сеціва

ШТО СТАІЦЬ ЗА «ПЕРЛАМІ» ПЕРЛІНА

«Феномен Перліна»

(«ЧЗ», 5 лістапада 2009 г.)

Тэлебачанне — загадка для абывацеляў, дзівосны свет, які вабіць многіх. Як апынуцца на тым баку экрана? Можна спадзявацца на выпадак, а лепш — на сябе. Яўген Перлін трапіў у эфір Першага нацыянальнага канала не за прыгожыя вочы, хоць для дыктара гэта таксама важна, а дзякуючы сваёй тэлегенічнасці і, безумоўна, працаздольнасці. Амаль кожную раніцу менавіта з вуснаў Яўгена мільёны беларусаў даведваюцца аб катастрофах і палітычных крызісах, але мало хто ведае, што яму ўсяго дзевятнаццаць гадоў, што ён марыць адкрыць уласны рэстаран і ставіць рэкорды па вымаўленні скорагаворак.

Ніхто і падумаць не мог, што артыкул выкліча такі рэзананс сярод чытачоў. Магчыма гэта абумоўлена тым, што галоўнай дзейнай асобай апынуўся «таварыш па цэху», але, усё ж падаецца, што праблема значна глыбей. Адны лічаць, што малады вядучы Беларускага тэлебачання дасягнуў пэўных поспехаў толькі дзякуючы звычайнай пратэкцыі, іншыя называюць галоўнай прычынай незвычайную працаздольнасць. Хто мае рацыю? Няхай на гэта пытанне адкажуць вашы каментарыі.

@

Тое, што Перлін завельмі малады — чвэрць гора: усе мы, дзяды, родам з маленства, а вось тое, што хлопчык жыцця не панюхаў (нават у арміі, хай і каля сталіцы, не паслужыў ні года!), што зоркавезунок-недавучка і змалку па рэстаранах ходзіць, што грошай кура не грабе... Вось гэта і ёсцека гора. І не толькі ягонае, персанальнае, але і дзяржаўнае. Бо не будзе з яго ўжо ніколі сапраўднага журналіста. Такога, скажам, якімі былі Аграноўскі, Галаванаў... Та-ак сабе, ганарысты гаварунок-папугайчык. Ну, як зараз вось. Не намнога больш. Я гарантую. Бо многа бачыў і бачу падобных у журналістыцы. Цяпер што ні газета альбо часопіс (салідныя, сур'ёзныя — па загалоўку), то, выбачайце, зборднужына лёгкапісак, з ліку «підагогаў» (дылетантаў і дылетантак як на ніве адукацыі, і, тым больш, у журналістыцы). Самае страшэннае, што ўсе яны пераканаными ў тым, што асы пяра. А ці годны такі ас (асаўка) напісаць праблемны артыкул, нарыс з жыцця вёскі, чалавека працы?.. Пусцеча нараджае, тыражыруе пусцечу. Інакш і быць не можа! Што датычыцца асабістых амбіцыйных планаў юнага Перліна, будучага СМІ-магната? Яны могуць здзейсніцца! Хто ж, калі не такія, выходзіць так рана з народа? Такія не выходзяць з народа за проста так. У горшым выпадку будзе яшчэ адзін начальнік ад СМІ, кшталту Хрусталёва. Лепш бы змалку ў бібліятэкі хадзілі, кніжкі разумныя чыталі, народа не цураліся . Шкада мне такіх. Маладых ды ранніх, і старэйшых, былых партакратаў, шкада. Ухапілі, прыхватызавалі, адхапілі, усюды паспелі, блатуны! Так, сёння яны багатыя, шчасцям адсвечваюць, але... такія парожнія душамі, што жах! Мне шкада людзей-пусцечак і іх нашчадкаў.

Анатоль.

@

Анатоль, я проста ўражана. Мужчына, а соплі распусціў. Ну нена, што ў сапраўднасці вы мала знаёмыя з творчасцю Аграноўскага, Галаванава, Пяскова ці класіка Гіляроўскага. Проста міналі. Ідзіце ж і далей, не стойце ў дзвярах і, Богам прашу, не размазвайце публічна свае соплі. Грып, ведаеце...

Святлана Аляксандраўна.

@

«Дарэчы, усе свае планы буду ажыццяўляць у Беларусі», — ну гэта фраза наогул мяне «порадовала».)))) Я — просты хлопец, які ўжо з 17 гадоў працуе на радыё, і з 19 працуе на Першым канале. І так можа кожны. Проста ў 19 гадоў прыйсці на Першы і сказаць, што хочаш там працаваць. Зразумела, што ўсё гэта не проста так: хтосьці там за яго слоўца замовіў на тэлебачанні. Гэта па-любому!!!

Stasya.

@

Затое, у адрозненне ад большасці студэнтаў журфака (і БДУ, і педа, і...), ён ведае, чаго хоча... І не проста сядзіць у чаканні працы (і няхай нават папулярнасці і прызнання), а робіць!!! Прабачце, а як стаць тым жа Аграноўскім, калі толькі чытаць падручнікі??? Ён працуе, і чым гэта дрэнна? Калі б не было ўмення і першапачатковай базы, проста за сімпатычную мордачку яго не сталі б браць на Юністар, на БТ. Няхай і 19 гадоў, але ў яго больш часу ўдасканальвацца, ён нашмат вышэй за многіх студэнтаў журфака і некаторых журналістаў са стажам. І калі ў яго ёсць мазгі, ён даб'ецца яшчэ большага. А рэстараны... Ён на іх зарабіў, і можа сабе іх дазволіць. І

@

«Без махнатай рукі тут ніяк не абышлося.»

Мне так падабаюцца такія паведамленні. Можна падумаць, што за любога бездара можна заплаціць, і ён тут жа будзе свяціцца на першым канале. Смешна. Ну няхай у газеце можна плаціць літаратурным рабам, а потым толькі прозвішча сваё дапісваць, а тут?!! А за яго, прабачце, не мама з татам, не махнатая рука ў эфіры — сам! І ў яго гэта добра атрымліваецца, асабліва, калі ўлічыць узрост і адсутнасць практыкі...

Проста ў чалавека добрае адчуванне прафесіі... Камусьці трэба гадоў 10, каб адчуць гэту прафесію, а яму дастаткова было года-двух... Акрамя таго, у яго фактура выдатная для вядучага навінаў...

«Сапраўды, адслужыў бы хлопец у арміі... Ці пацягаў жалеза ў сістэме праммашынабудавання — тады зведаў бы і людзей, і кошт грошам. « Вы гаворыце як пакрыўджаны студэнт, у якога Перлін забраў кавалак хлеба. А што вам перашкаджае пайсці працаваць па спецыяльнасці? Кожны другі студэнт журфака працуе.

Алена.

@

Размова ідзе пра тое, што гэтаму чалавеку дапамаглі трапіць на Першы канал. Сам бы ён туды проста так не трапіў. Хоць, улічваючы тое, што ў нас на тэлебачанне могуць узяць проста «чалавека з вуліцы», то што ўжо гаварыць пра гэтага Перліна. А вось ра месца працы, вы, Алена, не гаварылі б так. Зразумела, калі ў вас ёсць вопыт працы і ўсё іншае, то, магчыма, вам і не так цяжка ўладкавацца на працу. Якая-небудзь «захудалая» раённая газетка і то не хоча да сябе ў рэдакцыю браць студэнта. Паверце. Таму студэнты і абураюцца, што «ўсякія» там Перліны з лёгкасцю трапляюць на тэлебачанне, нават не скончыўшы ўніверсітэта.

Stasya.

@

Спачуваю вам, Stasya, калі вас не ўзяла раёнка! Мы з Перліным знаёмыя з першага курса. І я ведаю, праз што ён прайшоў перад тым, як трапіў на Першы. Аднойчы і я вось так проста прыйшоў на радыё і мяне ўзялі. Тут галоўнае жаданне і верыць у сябе. Калі гэтага не хапае ў вас — на журфаку не навучаць. Шукайце выйсце сама...

Павел.

Так супала, што размова ішла пра журналістаў. Але ж ёсць шмат маладых людзей, якія паспяхова займаюцца іншымі справамі. А ёсць і тыя, хто ніяк не можа знайсці сабе працу, хоць у кішэні даўно ляжыць дыплом аб вышэйшай адукацыі. А часам і не адзін. У чым тут прычына? Як вы лічыце, наколькі складана сёння маладым людзям знайсці працу. Раскажыце, як вы змаглі вырашыць гэта пытанне? З якімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца? Можа ваша гісторыя дапаможа камусьці пазбегнуць памылак і паверыць у сябе. Чакаем вашых лістоў.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

Пазнай свой край!

НЕ ВЕДАЮЦЬ ЛЮДЗІ КУЛЬТУРУ!

Аўтобусны прыпынак. У чаканні транспарту некалькі чалавек перасоўваюцца з месца на месца. Жанчына дастае з кішэні новы пачак цыгарэт, разгортвае яго, фольгу і цэлафанавую вокладку кідае на тратуар, становіцца побач і запальвае. Пасля — выкідвае недакурак на газон. Непадалёк маладая пара лузае семачкі і плюецца шалупіннем перад сабою. Так хацелася не заўважаць гэтых рэчаў і на ўсё плюнуць, але веданне этыкету не дазволіла зрабіць апошняга. Проста махнуў на гэта рукой. Усё ж такі еду ў культурнае месца...

Культуру ў масы

Самыя культурныя людзі сёння жывуць у вёсцы Культура. Знаходзіцца яна за 30 кіламетраў ад сталіцы. Да нядаўняга часу ніхто нават і не чуў пра такое паселішча. Усе лічылі, што гэта адна з вуліц вялікай вёскі Дудзічы. Звяртаць увагу на незвычайную сялібу пачалі пасля таго, як на ўездзе павесілі шыльду з назвай. Здарылася гэта гады тры таму. Але карэнныя жыхары і без усялякіх шыльдаў ведалі, што людзі яны культурныя.

Цікавую назву вёска ў Пухавіцкім раёне атрымала ў 1924 годзе. Гэта быў час, калі ў савецкай Беларусі адзін за адным пачалі з'яўляцца новыя пасёлкі. Звязана гэта было з абвешчанай электрыфікацыяй краіны. Многія сем'і дагэтуль жылі асобнымі хутарамі. Зразумела, што праводзіць святло да кожнай такой гаспадаркі было нявыгадна і нязручна. Таму людзей пачалі сяліць сумесна ў новазаснаваныя пасёлкі. Чаму для вёскі выбралі менавіта назву Культура — застаецца загадкай. Першых пасяленцаў даўно няма сярод жывых, а іх дзеці, якія дагэтуль засталіся тут, адказаць на пытанне не могуць.

Затое добра памятаюць людзі ваенныя гады. Валянціна Рыгораўна Саковіч нарадзілася і 78 гадоў пражыла ў Культуры. Расказала яна, як у 1943 годзе немцы цалкам спалілі пасяленне. Хаваліся і жылі пэўны час у зямлянках. У гэтай мясцовасці была партызанская зона. Дапамагалі з магарам з фашыстамі, чым маглі, але і аддаваць апошняга не збіраліся. Валянціна Рыгораўна расказала, як маці аднойчы схавала боты ў дровах, а бацьку не папярэдзіла. Так тады разам з дровамі боты і згарэлі. Вызвалілі вёску 4 ліпеня 1944 года.

Культуру неўзабаве адрадзілі. Памятаюць вяскоўцы, як прывозілі паказваць кіно. Спецыяльнага месца для прагляду не было, таму збіраліся ў чыйё-небудзь хаце і праектавалі стужку на сцяну. Быў калісьці сельскі клуб, для моладзі ладзіліся танцы.

Цяпер вёска падтрымліваецца ў парадку. Пакінутых хатаў няма, паваленых платоў таксама. Участкі дагледжаныя, дарога цудоўная. Дзеці і ўнукі старых прыязджаюць на дапамогу бацькам. Адным словам, усё тут культурна.

Ля вытокаў Культуры

Ад Культуры да Дудзічаў усяго 10 метраў дарогі. Уся інфраструктура мясцовасці сканцэнтравана менавіта тут. Сюды прыбывае і адсюль адпраўляецца аўтобус на Мінск, сюды жыхары Культуры ходзяць у краму. Але галоўныя каштоўнасці абодвух паселішчаў — царква і брацкае пахаванне — знаходзяцца на памежнай тэрыторыі ў 10 метраў.

Вёска Дудзічы старадаўняя, вядомая з 1600 года. Была ў свой час цэнтрам воласці. У канцы XVII стагоддзя шляхцічы Заранка-Грабоўскія пабудавалі тут уніяцкую царкву. Мястэчка ў 1766 годзе атрымала права тры разы на год праводзіць кірмашы і адзін раз на тыдзень таржок. На той час уладальнікам Дудзічаў быў Віцебскі ваявода Іосіф Прозар. Ён у 1769 годзе пачынае будаўніцтва прыгожага і вялікага драўлянага палаца пасярод пейзажнага парку. Тут знаходзілася багатая бібліятэка, было шмат карцін. А ў 1780 годзе на месцы старой пабудавалі новую ўніяцкую царкву. Пры ёй была адкрыта пачатковая школа.

Сапраўднае адраджэнне ў Дудзічы прыйшло з наступнымі гаспадарамі, Ельскімі. Атрымаўшы Дудзічы ў 1785 годзе, яны спрыялі развіццю земляробства і рамёстваў. Князь Станіслаў Ельскі нават запрасіў у вёску 20 замежных рамеснікаў, якія павінны былі навучыць сваёй справе мясцовае насельніцтва.

У 1800 годзе ў Дудзічах налічвалася больш за 300 чалавек, працаваў гарбарны завод, які належаў Ельскім. Для падтрымання добрага настрою местачкоўцаў працавалі тры карчмы. Існавалі батанічны сад і аранжарэя. У 1812 годзе праз вёску праходзіла Напалеонаўская армія.

Уніяцкую царкву пасля Полацкага сабора аддалі праваслаўным. Неўзабаве было створана народнае вучылішча. Прыход налічаў каля дзвюх тысяч чалавек! Пабудова была знішчана. Цяпер на яе месцы адбудавалі невялікую новую. Пастаяннага святара тут няма, прыязджае толькі на вялікія святы.

Зусім нядаўна побач з царквою адкапалі помнік Аляксандру II. Удзячныя сяляне такім чынам калісьці выказалі падзяку імператару за адмену прыгоннага права. Рэч сапраўды бясцэнная, таму што большасць такіх помнікаў была знішчана ў часы савецкай улады. Цяпер гэтую адкапаную каштоўнасць усталявалі каля царквы.

Паводле перапісу 1897 года, у Дудзічах тады пражывалі ўжо 602 чалавекі. У маёнтку Ельскіх быў на рацэ Пціч вадзяны млын. Цяпер ад яго застаўся толькі падмурак. Напрыканцы мінулага стагоддзя яго хацелі разбурыць, але знайшоўся разумны прадпрымальнік, які сарваў знішчальныя планы.

Гадоў пяць таму ў вёску завітала дэлегацыя, сярод якой былі нашчадкі князёў Ельскіх. Прыбылі яны з-за мяжы не проста так. Побач з Дудзічамі знаходзяцца старажытныя каталіцкія могілкі, на якіх пахаваны члены знатнай сям'і. Знайшлі дакладнае месца, паднялі з-пад зямлі шыкоўныя труны. Дагэтуль ніколі нікому гэтыя могілкі не былі цікавыя. Людзей хаваць тут перасталі на пачатку XX стагоддзя. І вось сабралася ўся вёска, прыехалі прадстаўнікі адміністрацыі, каталіцкія святары. Прывялі могілкі ў парадак, усталявалі крыж, правялі дарогу. Але цяпер дарогу сюды людзі згубілі. Не па асабістым жаданні, а з-за таго, што глебу вакол могілак перакапалі і зрабілі калгасным полем! Падысці да трунаў проста немагчыма...

Дарэчы, Ельскія з Дудзічаў мелі сваё стаўленне да культуры. Князь Казімір быў вядомым скульптарам у краіне, выкладаў у Віленскім універсітэце. Яго творы цяпер упрыгожваюць паркі і палацы Вільні і некаторых польскіх гарадоў. Міхаіл Ельскі — беларускі кампазітар, скрыпач — даваў канцэрты ў еўрапейскіх краінах. Жыў у Дудзічах. У 1902 годзе адбыўся вялікі канцэрт кампазітара ў родным мястэчку. Так сярод землякоў ён адзначаў 50-годдзе творчай дзейнасці. Князь Міхаіл напісаў больш за 100 музычных твораў, быў аўтарам шматлікіх артыкулаў.

Аляксандр Ельскі быў знакамітым беларускім гісторыкам, этнографам, публіцыстам, краязнаўцам, перакладчыкам. З'яўляўся членам Акадэміі ведаў у Кракаве. У вёсцы Замосце стварыў вядомы літаратурна-краязнаўчы музей. Яго фонды налічвалі 20 тысяч аўтографаў і дакументаў, 7 тысяч кніг, тысячу гравюр, вялікія калекцыі манет і археалагічных знаходак. Напісаў Аляксандр больш за 10 тысяч артыкулаў! Быў добра знаёмы з Дуніным-Марцінкевічам і першы напісаў біяграфію вядомага пісьменніка.

Магчыма, першыя пасяленцы вёскі Культура яшчэ добра памяталі князёў Ельскіх, якія сваёй дзейнасцю духоўна ўзбагачалі землякоў. Вось і вырашылі яны назваць пасёлак па-культурнаму. Ведаюць, праўда, вёску ў навакольных мясцінах мала. А хто і ведае, то па звычцы называе яе Дудзічы...

Уладзіслаў КУЗЬМІН.

ФУТБОЛЬНЫЯ МЕТАМАРФОЗЫ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Прыгожы і велічны Рым не прыцягваў увагі больш, чым футбол?

— Я бясконца шпацыраваў па Вечным Горадзе. Ён незабыўны. І сёння я разам з дзецьмі часта вяртаюся туды, каб яшчэ раз убачыць гэтую прыгажосць. Наогул, Італія падабаецца мне больш за іншыя краіны Еўропы. Мне чамусьці здаецца, што і па менталітэце італьянцы вельмі блізкія беларусам: такія ж ветлівыя і гасцінныя... Той, хто аднойчы пабываў у Рыме, вернецца туды прынамсі яшчэ раз.

— У Італіі вы гулялі пад кіраўніцтвам двух вядомых у мінулым футбалістаў: Фабія Капэлы і Данізля Пасарэлы. Капэла дасягнуў большага поспеху ў трэнерскай практыцы, а аргенцінец Пасарэла стаў двухразовым чэмпіёнам свету. Як працавалася з гэтымі своеасаблівымі трэнерамі?

— Пра Капэлу можна доўга апавядаць. Ён вялікі псіхолаг. Для яго трэнерскі працэс можа займаць другаснае значэнне, але ж ён так добра настройвае футбалістаў на матч, што проста здзіўляешся. З Пасарэлам мы працавалі сорак дзён. За гэты час мы прайгралі некалькі матчаў, і яго звольнілі. І ніякага меркавання аб ім так і не склалася.

Адчай Маставога

Нягледзячы на малую гульнявую практыку ў «Роме», Сяргей разам з іспанскай «Сарагосай» завалодаў Кубкам Іспаніі. Як лічыць сам удзельнік тых падзей, для яго фінальны матч супраць «Сельты» стаў адным з лепшых у замежнай кар'еры.

— Цікава, што напярэдадні фіналу агент паведаміў мне, што я ўжо з'яўляюся футбалістам «Пармы», — кажа Сяргей. — Так адбылося, што перад апошнім матчам за «Сарагосу» я стаў гульцом іншай каманды. Аднак самае дзіўнае было напярэдзе. За тыдзень да фінальнай сустрэчы трэнер каманды папрасіў мяне прагледзець касету з матчам «Сельты». А за некалькі дзён да гульні ён паведаміў, што я павінен буду гуляць на полі дзе заўгодна, але толькі не ў цэнтры. Пра задуму ведалі толькі я і кіраўніцтва каманды. Мы выйшлі на поле і перамаглі з лікам 3:1. Памятаю, што пасля сустрэчы Аляксандр Маставой (былы гулец зборнай Расіі, легенда «Сельты дэ Віга». — **Т.Ш.**) плакаў. Для яго і каманды гэта была трагедыя. Яны трэці раз запар саступалі ў фінале Кубка Іспаніі.

— У час, калі вы выступалі ў Італіі і Іспаніі, хадзіла шмат размоваў пра дагаворныя матчы...

— Так, у Італіі законам наогул забаронены ўдзел футбалістаў на таталізатары. Падобнае рашэнне здаецца мне разумным. Толькі варта, каб яшчэ і суддзі неслі за гэта адказнасць.

— Пасля замежных сезонаў вы вярталіся дадому з радасцю? Усё ж такі хочацца ўбачыць родных і сяброў...

— Ведаеце, жонка была не супраць, каб я застаўся ў Італіі. «П'ячэнца» прапаноўвала мне новы кантракт, але я вырашыў пераехаць у Маскву...

Шчырасць Светлакова

Ён зноў вярнуўся у стары і добра знаёмы «Лакаматыў». Там яго чакалі не толькі сябры, але і балельшчыкі, якія ў мінулым годзе прызналі Сяргея лепшым футбалістам «чырвона-зялёных». Пяць сезонаў у «Лока» — і Гурэнка вяртаецца на радзіму. Чэмпіянат ён пачаў футбалістам, а скончыў галоўным трэнерам. Аднак для шматлікіх заўзятараў ён застаецца Гурыкам у чырвонай майцы зборнай Беларусі і з капітанскай павязкай на руцэ...

— У душы я яшчэ футбаліст, — з усмешкай разважае наш суразмоўца. — І часам бывае, калі мяч недалёка ад мяне на полі, так і хочацца кінуцца ў барацьбу. Я ведаю, што гэта з часам пройдзе. Аднак у думках я заўжды на полі са сваімі хлопцамі.

— Як моцна вы перажываеце паражэнні каманды?

— Я імкнуся ўсё хуценька прааналізаваць і забыцца. Так і з перамогай. Нехта сказаў: «Каб рушыць далей, футбаліст павінен пасля матча забывацца на перамогі».

— Як вы адпачываеце пасля цяжкай гульні?

— Люблю паслухаць Высоцкага ці Лепса, альбо кнігу гістарычную пачытаць, каб толькі яна была заснаваная на фактычным матэрыяле. Часам разам са старэйшым сынам мы вудзім рыбу. Мне гэта дапамагае адагнаць нядобрыя думкі, адпачнуць...

— Я чуў, што ў Маскве вы пазнаёміліся з вядомым вядучым Сяргеем Светлаковым...

— Мы выпадкова сустрэліся ў краме і разгаварыліся. Бацькі Сяргея працавалі на чыгунцы, і ён таксама заўзятар «Лакаматыва». Сяргей вельмі просты, шчыры і прыемны ў размове чалавек. Гэта прыклад таго, калі грошы і слава не могуць згоршыць чалавека. Мне было вельмі прыемна кантактаваць з ім.

— Але ж у Маскве вы не засталіся...

— Для мяне Масква — горад для працы. Так, той, хто там нарадзіўся, ужо звыкся з гэтым. Але для мяне жыццё там вельмі цяжкое і чамусьці нагадвае бег па коле.

Тарас ШЧЫРЫ.

Цікавы праект

«БЕЛАРУСЬ У АСОБАХ: МОЛАДЗЬ ПРАЗ 15 ГАДОЎ»

ПАД такой назвай Фонд ААН у галіне народанасельніцтва распачаў новы праект у нашай краіне.

Нагадаем, яшчэ ў 1994 годзе прадстаўнікі 197 краін свету ў Каіры на Міжнароднай канферэнцыі па народанасельніцтве і развіцці дамовіліся аб стварэнні перспектыўнага плана (яго назвалі Каірскім Кансенсусам), які потым ператварыўся ў Праграму дзеянняў дзяржаў на 20 наступных гадоў.

Дык вось, мэта праекта ў Беларусі — прасачыць, наколькі змянілася жыццё маладых людзей у сувязі з дасягненнем вызначаных мэтаў Праграмы дзеянняў. Гісторыі ўдзельнікаў праекта, іх лёсы і погляды адлюстроўваюць сучасную сітуацыю і тэндэнцыі ў грамадстве.

Адзін з герояў праекта Максім Сокал — акцёр, рэжысёр, клапатлівы муж і малады тата, які скарыстаў магчымасці беларускага заканадаўства і пайшоў у адпачынак па доглядзе дзіцяці. Студэнтка Беларускай акадэміі мастацтваў Людміла Арлова абвяргае гендарны стэрэатып пра тое, што тэлеаператар — гэта асабліва мужчынская прафесія. Мінчанка Юлія распавядае аб сваім мацярынскім шчасці: дыягназ ВІЧ не перашкодзіў дзяўчыне ўдала выйсці замуж і нарадзіць дзіця. Нямецкі валанцёр Ханс Пробст распавядае пра неацэнны досвед, які ён атрымаў за год працы ў беларускім псіханеўралагічным інтэрнаце ў Навінках. Выхадзец з Лоева, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага Віталь Краўчанка дзеліцца сваім пазітыўным досведам: у вялікім горадзе ажыццявіліся яго самыя запаветныя мары.

У якасці экспертаў у праекце ўдзельнічаюць начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей Бягун, намеснік дырэктара па навуковай працы Мінскага навукова-даследчага інстытута сацыяльна-эканамічных праблем Алег Кабяк, сямейны псіхолаг Дыяна Комлач, галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Аляксандр Барсукоў, эпідэміёлаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ларыса Касінская.

Леанід ТУГАРЫН.

ПРАВІЛЫ ЯК ЯНЫ ЁСЦЬ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Таксама праводзіць «нелегалаў», якія любяць заставацца ў інтэрнаце на ўсю ноч, ну і зразумела, псаваць маёмасць універсітэта. За парушэнне гэтых элементарных правілаў можна застацца без права атрымання месца ў інтэрнаце наогул. І гэта не мае значэння: засялялі цябе па льготе, як актыў ці проста па чарзе. Перад студэнцкім саветам роўныя ўсе.

Ёсць выпадкі, калі студэнты спрабуюць скарыстаць сяброўства ці знаёмства з Вольгай у сваіх асабістых мэтах, нават самі таго не ведаючы. Проста нейкая ўстаноўка ёсць, што можна зрабіць паблажку, дык чаму б ёй не пакарыстацца. Гэта ўсё залежыць ад саміх людзей і ступені іх выхаванасці. Не абыходзіцца, безумоўна, і без зайздрасці і плётак. Гэта звычайная з'ява. Негатыў, прычым, адчуваецца даволі значна.

— Нехта мне ў вочы кажа, што я такая ж студэнтка, як і ўсе, таму слухаць мяне ніхто не збіраецца, а тым больш паважаць. А нехта са мной вітаецца на ўзроўні адміністрацыі інтэрната, паколькі на іх погляд я ну хоць у нейкай ступені знаходжуся вышэй за іх. Звычайная з'ява.

Нават у калектыве студэнцкага актыву і то сустракаюцца выпадкі карыстання сяброўствам са старшынёй студсавета. Праяўляецца гэта звычайна ў самых элементарных рэчах: зацяжка са здачай дакументацыі, у спадзяванні на міласэрнасць і сяброўства з Вольгай, паралельнае стаўленне да выканання сваіх абавязкаў... Чалавечы фактар і ад яго нікуды нельга схавацца. Менавіта таму Вольга сяброе толькі з самымі-самымі. Шмат сяброў быць не можа, паколькі гэтыя адносіны не будуць шчырымі.

— Дай волю, — кажа дзяўчына, — дык усе будуць напрошвацца да мяне ў сябры ці сяброўкі, а карысці ад гэтага толькі паменшыцца. Гэта няправільна.

Так, нейкія грошы за працу ў студэнцкім актыве плацяць, але не сказаць, каб надта вялікія. Вользе, як старшыні, выпадае атрымліваць 40 — 80 000 кожны месяц. Гэта ў залежнасці ад тых сродкаў, якія будуць дадзеныя ўніверсітэтам. Раз на раз не прыходзіцца. Нехта можа падумаць, што людзі рвуцца на пасады студэнцкага актыву дзеля грошай, але самі бачыце, што сродкі тут выдаткоўваюцца невялікія і залатыя горы не абяцаюць. А вось турбот хапае: тут і зборы самога студсавета па два разы на месяц, і штомесячны студэнцкі савет універсітэта, і напісанне дакументацыі, а таксама падрыхтоўка інтэрнатаў пасля лета да прыёму студэнтаў, ды і само засяленне... Сапраўды хапае турбот, над якімі трэба папрацаваць. Ёсць старшыня студэнцкага савета ўніверсітэта, якому падпарадкоўваюцца ўсе астатнія, што называецца «рэгіянальныя» старшыні.

Часцей да «шкоднікаў» падчас правядзення студсавета ставяцца лаяльна, спрабуючы абмежавацца папярэджаннем ці вымовай. Толькі ў самых-самых сітуацыях справа можа дайсці да высялення і страты права на атрыманне месца ў наступным годзе.

— Калі мы бачым, што чалавеку сорамна і ён спрабуе неяк з намі кантактаваць, не хлусіць і не хаміць, то, вядома ж, ідзём яму насустрач. А калі ён не паважае ні нас, ні сябе самога, то якая можа быць размова. Выселім, хоць кожны раз спрабуем змагацца да апошняга, зразумець сітуацыю.

Студэнцкі савет існуе ў кожным універсітэце, і ў кожнага з іх ёсць свая спецыфіка працы. Але мэта ў іх адна — абарона правоў і інтарэсаў студэнтаў, адначасова з выхаваннем у іх паважлівага стаўлення да сваіх абавязкаў з тэрміновым і своечасовым іх выкананнем. Зразумела, у кожнага студэнта свая думка і свая жыццёвая пазіцыя. Мне падаецца, калі ўжо жыццё закінула нас на вялікі човен пад назвай «Студэнцтва», і нам даводзіцца плысці ў ім разам, дык трэба неяк і размеркавацца, каб не ўзнікалі навальніцы ўнутры яго, бо іх хапае ў агульным акіяне жыццёвых пазіцый і абставінаў. Як жыць і дзе — залежыць ад нас. Галоўнае — быць разам.

На студсавет трапіла студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Твой вобраз

МУЖЧЫНСКІЯ ПРЫЧОСКІ НАДЫХОДНАЙ ЗІМЫ

Сучасныя мужчыны ўсё больш сталі клапаціцца пра сваю знешнасць, прычым у сваім імкненні да прыгажосці яны бываюць нават больш скрупулёзнымі чым дамы. Не апошнюю ролю ў стварэнні прывабнага сэксуальнага вобразу адыгрывае прычоска. Добра выкананая стрыжка можа змяніць выраз твару, прыглушаць яго недахопы. Заўважана, што модныя і густоўна выкананыя прычоскі надаюць упэўненасць у сабе і ўпрыгожваюць жыццё.

Існуе велізарнае мноства самых разнастайных мужчынскіх прычосак. Можна паэксперыментаваць самому, але лепш звярнуцца да дасведчанага цырульніка-стыліста. Ён дапаможа выбраць тое, што ідзе менавіта вам і што будзе спалучацца з усім астатнім у вашым выглядзе.

Апошнія модныя тэндэнцыі

Кароткім і дагледжаным валасам сёння аддае перавагу большасць сучасных вядомых і не вельмі мужчын. Гэта кароткія (па ўсёй акружнасці галавы) стрыжкі, такія, скажам, «ахайныя галоўкі». Ніякага намёку на беспарадак.

Класіка — самыя папулярныя мужчынскія прычоскі. Гэта свайго роду «ўспамін» пра модныя мужчынскія прычоскі 1950-х гадоў, калі ўсе валасы спераду зачэсваюцца назад, але трохі адхіляюцца ў адзін бок.

КАРОТКІЯ ВАЛАСЫ



Парады стылістаў на канец 2009 — пачатак 2010 года

Дзе павінен быць прабор?

Стылісты сцвярджаюць, што цяпер гэта не мае значэння. Прабор робіцца там, дзе валасы распадаюцца на прабор натуральнай выявай, а затым наносіцца крыху сродку для ўкладкі, каб надаць глянец вонкаваму выгляду валасоў. Ніякага гвалту! Сапраўды, гэта настальгія па 1940-м і 1950-м — перыяду Хемфры Богарта, Аль Капоне. Паглядзіце стары фільм «Супермен» з Кларкам Кентам: яго валасы — якраз тое, што трэба.

ВАЛАСЫ СЯРЭДНЯЙ ДАЎЖЫНІ

Ці ёсць класічныя прычоскі, якія пераходзяць з сезона ў сезон?

Ёсць, але само паняцце «класічная прычоска» ў любым выпадку з часам атрымлівае новы сэнс. Сёння класікай жанру лічыцца злёгку растрапаная, моцна тэкстураваная прычоска, якая стварае эфект bed head — «толькі што з пасцелі». Не перабярыце з укладачным сродкам: злёплыя ігольчастыя пасмы — для тых, хто затрымаўся ў 90-х.

Што такое прычоска, якая не патрабуе ўкладкі?

Гэта стрыжка, выкананая настолькі правільна, што патрабуе мінімум намаганняў па ўкладцы. Калі майстар рабіў стрыжку, арыентуючыся на форму галавы, авал твару і тып валасоў, яна лёгка кладзецца сама сабой. У адваротным выпадку вы будзеце змушаны траціць занадта шмат часу і ўкладачных сродкаў на тое, каб выглядаць належным чынам.

Якая самая вялікая магчымая памылка ў стварэнні прычоскі?

Самая вялікая памылка — выбар няправільных сродкаў для ўкладвання. Напрыклад, воск ці «цягучка» для ўкладкі з эфектам бляску дадаюць жвавасці і ўвільгатнення сухім валасам, а вось звычайным і тлустым не падыдзе — толькі надасць ім сальны выгляд. Для валасоў, якія не патрабуюць увільгатнення (звычайных, тоўстых) выбірайце сродкі для ўкладвання з матавым эфектам (звычайна ўказваецца на ўпакоўцы).

Іншы распаўсюджаны ляп — занадта вялікая колькасць укладачнага сродку. Наносіць яго варта на сухія (а не мокрыя) валасы.

Правільна выбірайце шампунь, бо тут таксама можна нарабіць нямала памылак. Калі валасы тонкія і далікатныя, не выкарыстоўвайце шампунь, які ўвільгатняе: ён абцяжарыць іх і пазбавіць аб'ёму.

ДОЎГІЯ ВАЛАСЫ

Ці нармальна для мужчыны фарбаваць валасы?

Сёння, у зорную гадзіну касметычнай індустрыі, разнастайных фарбаў для валасоў больш чым удосталь. Мужчынскія фарбы адрозніваюцца больш натуральнымі адценнямі, у палітры шмат колераў, заснаваных на шэрым — колеры сівізны, якую і імкнуцца зафарбаваць джэнтльмены. Нічога дрэннага ў гэтым няма.

КУЧАРАВЫЯ ВАЛАСЫ

Меліраванне — гэта ўсё яшчэ модна?

Гэта ўжо неактуальна. Мабыць, добры толькі адзін яго варыянт: пасмы валос, асветленыя ці прыцемненыя на адзін тон. Такое афарбоўванне надае прычосцы аб'ём, рэльеф, а калі гаворка ідзе пра асвятленне на адзін тон, то і эфект выгаралых на сонцы пасмаў.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

Тэлесеткі

АЎТАРЫ НОВЫХ ПЕСЕНЬ АПЫНУЦЦА Ў СУДЗЕ. МУЗЫЧНЫМ

«Музычны суд» — новы праект канала АНТ, які стартуе 20 лістапада. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на запісе адной з першых праграм і высветлілі, каго, як, а галоўнае, за што будуць судзіць.

Як высветлілася, «Музычны суд» — гэта вынік таго самага конкурсу песень, які тэлеканал абвясціў яшчэ летам гэтага года пад заклікам «50 тысяч долараў за песню для «Еўрабачання». Праўда, цяпер у сувязі з цэлым шэрагам акалічнасцяў слова «Еўрабачанне» ў дачыненні да тэлепраекта гучыць у зусім іншым кантэксце — гледачы і суддзі абмяркоўваюць, ці маглі б конкурсныя песні прадставіць нашу краіну на міжнародным узроўні — ***напрыклад, на «Еўрабачанні»,*** — а аўтару песні-пераможцы абяцаная ад АНТ паездка на «Еўрабачанне-2010» у Нарвегію.

І тым не менш нават пры гэтых умовах аўтары, самародкі і прафесіяналы, праявілі да конкурсу павышаную цікавасць. Як расказалі нам у прэс-службе АНТ, на 1 кастрычніка было атрымана больш за 200 работ з усяго свету (так, сярод канкурсантаў ёсць Ібіца, Нідэрланды, Фінляндыя, а ёсць і ветэраны беларускага нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» — у прыватнасці, гурт «Litesound» пасля чатырох гадоў спробаў вырашыў узяць конкурс зморам і выступіць у якасці калі не выканаўцаў, то сааўтараў песні). З дасланых песень творчая экспертная камісія — імёны яе ўдзельнікаў не называюцца, каб выключыць магчымасць аказання на іх ціску з боку пакрыўджаных аўтараў — адабралі 25 песень для ўдзелу ў прэм'ернай серыі: 5 праграм па 5 кампазіцый у кожнай. А пакуль з іх суддзі і гледачы будуць выбіраць найлепшыя — прыём заявак працягнуты да 1 лютага 2010 года, так што праект абяцае стаць доўгайграючым.

Зрэшты, больш чым перспектывамі «Музычнага суда» гледачы, якія сабраліся на здымкі праекта ў Нацыянальнай школе прыгажосці, цікавіліся, хто рызыкне руліць працэсам. І тут усіх чакаў сюрпрыз.

— Ах, якая жанчына! — сустрэла мужчынская частка аўдыторыі выхад на сцэну вядучай, бялявай прыгажуні Сашы Паўлавай.

— Яна ж уся сіліконавая! — пырхалі гледачыжанчыны, але пагасіць мужчынскія захапленні гэтым не атрымалася.

Што да суддзяў, то ў іх выбары прадзюсары АНТ сумясцілі логіку і папулізм. Як вядома, у музыцы і футболе ў нас разбіраюцца ўсе без выключэння, таму ў журы, што будзе мяняцца кожную праграму, запрошаныя як асобы больш-менш прафесійныя — папулярныя выканаўцы, прадзюсары, кампазітары, тэле- і радыёвядучыя, музычныя журналісты, — так і «проста слухачы» — хатнія гаспадыні, настаўнікі, медыцынскія работнікі і г.д. Зрэшты, можа яно і правільна: няхай аўтары хоць раз напрамкі даведаюцца, што думае пра іхнія «нятленкі» публіка. Тым больш, што пасля кожнай песні — а гэта ўжо стала сюрпрызам для суддзяў — яе аўтар выходзіць на сцэну і ўважліва слухае ўсе заўвагі. А сярод іх трапляюцца і вельмі жорсткія.

— Нічога такая, — ацаніў чарговую кампазіцыю Аляксей Хлястоў. — На жаль, гэта і ўсё, што можна аб ёй сказаць. Асабіста я ў гэту песню грошай не ўкладваў бы.

— Нават на конкурсе «Песню бярыце з сабою» яна нявартая з'явіцца, — вынес прысуд яшчэ адной конкурснай заяўцы спявак і тэлевядучы Дзмітрый Врангель.

— Песня, у любым жанры — гэта справа цёмная, — астудзіў судзейскі запал калег кампазітар Ігар Лучанок, узгадаўшы, што некаторыя з яго ўласных песень былі нізка ацэненыя на конкурсах, але тым не менш «пайшлі ў народ».

Самым цяжкім для членаў журы аказалася патрабаванне ацэньваць па 10-бальнай сістэме толькі песні, а не выкананне і выканаўцаў (у ролі апошніх выступілі ўдзельнікі тэлепраекта «Новыя галасы Беларусі», якіх спецыяльна, каб не адцягвалі ўвагу, апранулі спрэс у чорнае, але дапамагло гэта мала). «Як можна не звяртаць увагі на выканаўцу, калі перад табой прыгожанькая дзяўчына? — здзіўляліся ў перапынках суддзі. — Тады было б лепей паставіць на сцэне непразрысты экран, каб угадваўся толькі сілуэт...». З гэтым меркаваннем была салідарная і публіка ў зале, узнагароджваючы маладых спевакоў апладысментамі за асабістае абаянне, незалежна ад якасці песень, якія гучалі.

«Я лічу, што трэба ісці ад выканаўцы да песні — спачатку шукаць вобраз, а потым ужо адпаведную яму кампазіцыю, — падзяліўся ўражаннямі пасля запісу адзін з суддзяў, лідар гурта «Палац» Алег Хаменка, які не так даўно сам выступаў у ролі канкурсанта. — І тым не менш такі фармат адбору таксама даволі цікавы. А тое, што з'явіцца шмат новых імёнаў і цікавых песняў — у любым выпадку вялізны плюс гэтага праекта». А многія з аўтараў бачаць «плюс» ужо ў тым, што іхнюю творчасць пачуюць. «Я не быў на радзіме бацькоў 40 гадоў, — расказаў адзін з аўтараў, пенсіянер Яўген Малашка з Крывога Рога (Украіна). — І цяпер шчаслівы проста ад таго, што атрымалася прыехаць, сустрэцца з роднымі ды яшчэ асабіста сказаць беларусам, як я іх люблю!».

...Роля адвакатаў у «Музычным судзе» выпала тэлегледачам, якія з дапамогай СМС выберуць у кожнай праграме сваю песню-фаварытку. Такім чынам, у фінальнай праграме прагучаць 10 песень — 5 з іх абярэ журы, 5 «выратуюць» гледачы, і яны ж пасля тэлефонным галасаваннем ад кожнай вобласці Беларусі вызначаць пераможцу фіналу. Лёс 50 тысяч долараў мяркуецца вырашыць пасля завяршэння ўсіх этапаў праекта «Музычны суд».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СІМВОЛІКА ПРАВАГА І ЛЕВАГА НА ВЯСЕЛЛІ

Свет і сусвет Чалавека

Уявіце сабе, што маладая пара ўваходзіць у храм, каб стаць пад вянец: нявеста становіцца па левую руку ад жаніха, злева ад алтара, бліжэй да выявы Багародзіцы, жаніх — справа, бліжэй да малюнка Ісуса Хрыста. Зараз ужо няма неабходнасці прыводзіць нейкія доказы, каб усім стала зразумела, што той жа самы прынцып павінен ляжаць і ў аснове рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе. Побач з маладымі стаяць самыя блізкія прадстаўнікі іх родаў — шафер і шаферка (сёння гэта ганаровыя сведкі), прычым кожны займае «сваё» месца: шаферка каля нявесты, а значыць на левай палове храма (ЗАГСа), шафер размяшчаецца справа ад жаніха.

Як расцаніць тое, што сёння ў ЗАГСах жаніха ставяць злева, а нявесту — справа, як зразумець, што шафер сёння чамусьці сядзіць побач з нявестай, а не са сваім лепшым сябрам — жаніхом? А можа, мы ўжо на самім вяселлі «закладваем» бестурботнае жыццё-быццё нашых маладых, калі паход «налева» будзе заканамерным?

● За вясельным сталом жаніх і нявеста садзіліся так, як яны стаялі ў храме пры шлюбе: нявеста злева ад жаніха. (Дарэчы, такое размяшчэнне шлюбнай пары за сталом захоўвалася на працягу ўсяго жыцця! Нават уначы муж і жонка павінны спаць так, каб жонка знаходзілася злева.)

● Госці, радня, якія прыйшлі на вяселле, таксама рассаджваліся за святочным сталом паводле сваёй прыналежнасці: па правую руку ад жаніха — прадстаўнікі яго роду, а па левую — радня нявесты.

● Шафер садзіўся побач з жаніхом, шаферка — побач з нявестай.

● Заручальныя пярсцёнкі праваслаўныя надзяваюць на правую руку.

● Вясельныя знакі адрознення — «кветачкі» — жаніх і яго сябры — шаферы прымацоўваюць з правага боку, нявеста і яе сяброўкі — з левага; ручнік свату перавязвалі вузлом справа, свацці — вузлом злева.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дзве даты

20 лістапада

1948 год — нарадзілася Яўгенія Янішчыц, выдатная беларуская паэтэса. Аўтар лірычных зборнікаў «Снежныя грамніцы», «Дзень вечарова», «Ясельда» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы.



1922 год — у Массавеце Ленін апошні раз выступіў з публічнай прамовай. Праз некалькі дзён хвароба змусіць яго назаўсёды пакінуць Маскву.

Цытата дня

«Што б пра цябе ні думалі, рабі тое, што лічыш справядлівым. Будзь аднолькава раўнадушным і да крытыкі, і да пахвальбы».

Піфагор Самоскі, старажытнагрэчаскі пісьменнік і грамадскі дзеяч.

Усміхнемся!

У жаніха пытаюцца:

— Пры наведванні дома сваёй нявесты што вам у першую чаргу кінулася ў вочы?

— Цешча! Дагэтуль твар падрапаны!

☺

Паважаныя грамадзяне! Для выкліку ліфта маюцца дзве кнопкі. Націсніце верхнюю, калі хочаце ехаць уверх, націсніце на ніжнюю, калі хочаце ехаць уніз.

Націсніце адразу абедзве кнопкі, калі хочаце пачуць адзнаку вашага інтэлекту.

☺

— Што робіш?

— Спрабую форму не страціць.

— Дык ты ж цяпер ясі як не ў сябе!

— Ну дык форму жывата і спрабую не страціць!

☺

У сучаснага мужчыны павінна быць гарачае сэрца і халоднае піва!

Сёння

Месяц

Маладзік 16 лістапада.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.46	16.04	8.18
Віцебск —	7.41	15.47	8.06
Магілёў —	7.36	15.54	8.18
Гомель —	7.26	15.57	8.31
Гродна —	8.00	16.20	8.20
Брэст —	7.54	16.27	8.33

Імяніны

Пр. *Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара.*

К. *Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Надвор'е на заўтра



АДСТРАЛЯЛІСЯ

Каля в. Трухановічы затрымалі двух жыхароў Пружан, якія на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» застрэлілі казулю. Шкода ацэненая ў 6 млн 300 тыс. рублёў.

А пад Баранавічамі беспрацоўны з в. Калпеніцы забіў дзіка непадалёк ад вёскі. Яму давядзецца выплаціць больш за 3 мільёны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Повторный аукцион по продаже недвижимого имущества государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания состоится **23 декабря 2009 г. в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб 227.

На открытый аукцион выставляется:

№ лота	лот № 1	лот № 2
Предмет открытого аукциона	Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (инвентарный номер 500/С-30592) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания	Здание специализированное для общественного питания (инвентарный номер 500/С-15244) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, пр. Пушкина, 68	г. Минск, пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50, корп. 2
Начальная цена предмета открытого аукциона, руб.	1 097 801 540 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 388 483 140 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 709 318 400 белорусских рублей)	782 485 000 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 221 812 400 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 560 672 600 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	109 780 150 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	78 248 500 белорусских рублей, до подачи заявления на проведение аукциона, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Продавец недвижимого имущества	Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь 220048, г. Минск, ул. Мясникова, 39, тел. (8017) 226 54 29, 226 54 34	Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1159 га, кадастровый номер земельного участка – 500000000006003509	Общая площадь – 0,2180 га (из них 0,2180 га с ограничениями в использовании – водоохранная зона Слепянской водной системы), кадастровый номер земельного участка – 500000000001004107
Арендодатель земельного участка и срок аренды	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 80 лет	Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 33 года
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 1565,0 кв.м, год постройки – 1989. Отдельностоящее, четырехэтажное здание, стены кирпичные, требуется обследование и проведение капитального ремонта	Общая площадь – 811,5 кв.м, год постройки – 1960. Отдельностоящее, одноэтажное здание в неудовлетворительном техническом состоянии, нет оконных и дверных блоков, стены кирпичные, разрушена система отопления, холодного и горячего водоснабжения. Длительное время не использовалось
Условия использования недвижимого имущества	Для физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения	Для дальнейшего использования в соответствии с градостроительными регламентами здания под общественную функцию (общественное питание, объект торговли, культурно-бытовое назначение, административно-хозяйственное назначение)
Условия использования земельного участка	Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества. Беспрепятственный проезд к зданию победителю аукциона обеспечивает ОАО «Опытный завод металлоконструкций»	Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества.

Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: **г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227** – по рабочим дням **с 9.00 до 17.00.** Последний день приема заявлений – **22 декабря 2009 года включительно.**

Извещение о проведении открытого аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 18 сентября 2009 года № 176 (26534).

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения – часть платы) и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер, порядок и сроки возмещения затрат доводятся до сведения участников до начала проведения аукциона. Условия и порядок предоставления рассрочки платы за право заключения договора аренды земельного участка определены решением Минского горисполкома от 30 апреля 2009 г. № 1015.

